Нурэцкія „Незабудкі” ☞ 3



Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Спеў у Рыбалах ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 08 (2806) Год LV | Беласток, 21 лютага 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Шчыра, адкрыта, рашуча?

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Размова міністраў замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага і Беларусі Сяргея Мартынава ў Варшаве мела датычыць галоўным чынам малога памежнага руху паміж абедзвюма краінамі ды м.інш. пытанняў звязаных з энергетычнай палітыкай, узаемнымі інвестыцыямі і ажыццяўляннем праграмы „Усходняе партнёрства”. Аднак пераважылі праблемы польскай меншасці ў Беларусі, прадстаўнікі якой, звязаныя з Саюзам палякаў Беларусі ўзначаленым Анжалікай Борыс, асабліва ў апошнія дні перад візітам міністра Мартынава былі падвергнуты ўзмоцненым рэпрэсіям. Падпісаная 12 лютага ў варшаўскім Палацы МЗС па вуліцы Фоксаль польска-беларуская дамова аб малым памежным руху рыхтавалася ад двух гадоў, згодна адпаведнаму распараджэнню Еўрапарламента і Еўрапейскай рады ад снежня 2006 г. Ахопліваць будзе яна 93 г.зв. адміністрацыйныя адзінкі (гміны, гарады) трох ваяводстваў: Падляшскага, Люблінскага і Мазавецкага (каля 590 тыс. жыхароў). З беларускага боку — 89 падобных адзінак (сельсаветы і гарады — каля 1 мільёна 100 тысяч жыхароў). На абшары малога руху не апынецца Беласток, а з беларускага боку ахопіць ён Гродна і Брэст. Перасяканне мяжы будзе адбывацца ў спрошчаным рэжыме, без віз, на падставе дазволу двухгадовай сапраўднасці, у выпадку выдачы яго першы раз, і пяцігадовай у выпадку чарговай выдачы. Выдаваць іх будуць консульствы ў Беластоку, Белай-Падляшскай, Гродне і Брэсце. Карты малога памежнага руху атрымаюць асобы прапісаныя ў гэтай зоне сама меней тры гады. Мяркуецца, што зацікаўленых атрыманнем карт будзе штогод каля 100 тысяч чалавек па абодвух баках мяжы. На іх падставе будзе можна шмат разоў перасякаць мяжу без візы і пашпарта, прабываць у прыгранічнай зоне максімальна 90 дзён цягам паўгода, лічыўшы ад першага ўезду. Аплата за выдачу дазволу гэта 20 еўра. Звольненыя з яе будуць інваліды, пенсіянеры і дзеці да 18 гадоў. Абавязковым будзе таксама набыццё страхавога медычнага полісу на перыяд не карацейшы чым 14 дзён да сумы 20 тысяч еўра.

— Спадзяюся, што гэтая дамова спрычыніцца да падтрымання сямейных і суседскіх сувязей, гандлёвага абмену і развіцця прыгранічных тэрыторый, — сказаў міністр Сікорскі пасля падпісання дамовы. — Спадзяюся таксама хуткай яе ратыфікацыі [абодвума парламентамі — М. Х.] і таго, што ўвойдзе яна ў сілу яшчэ сёлета.

Міністр Мартынаў (гаварыў па-англійску — шкада, што не па-беларуску) падкрэсліў значэнне дамовы для далейшага супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю.

— Гэта першае такое паразуменне Беларусі са сваім суседам. Спадзяюся, што будзе гэта крок Еўрасаюза, у тым ліку і Польшчы, да таго, каб быў адменены дыскрымінацыйны рэжым у адносінах да Беларусі.

Успомніў таксама аб іншых пытаннях, якія краналіся ў час сустрэчы, між іншым аб „Усходнім партнёрстве”:

— Залежыць нам на тым, каб „Усходняе партнёрства” ажыццявілася.

У час кароткай прэс-канферэнцыі ўдалося паставіць па адным пытанні тром журналістам з тэлебачання БелСат, Польскага радыё для замежжа, Радыё РФМ і аж чатыры „Ніве”. Пыталіся мы, калі можна чакаць ратыфікацыі дамовы аб малым памежным руху з беларускага боку, ці ёсць магчымасць, што прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка яе не адобрыць (не падпіша), ці ёсць яшчэ шанцы, каб Еўрапейская камісія дала згоду на пашырэнне зоны свабоднага руху з 30 да 50 кіламетраў і ўрэшце як па абодвух баках мяжы падрыхтаваны да ўступлення ў сілу дамовы мытныя і памежныя службы. Міністр Мартынаў адказваў:

— Вясенняя сесія нашага парламента пачынаецца ў красавіку. Тады будуць абмяркоўвацца ўсе міжнародныя пытанні і тады таксама гэтая дамова будзе змешчана ў парадку дня. Не чакаем тут ніякіх спазненняў (...). Беларусь прыступала да гэтых перамоў з добрай верай. Прэзідэнт Беларусі, так як кожны прэзідэнт, мае, вядома, права на сваё суверэннае рашэнне, ды спадзяюся, што таксама ў гэтым выпадку ўлічыць ён рэкамендацыю міністра замежных спраў.

Беларускі міністр выказаў перакананне, што беларускія мытныя і памежныя службы справяцца з ажыццяўленнем да-

працяг ☞ 2

ЗАПРАШЭННЕ

Беларускае Радыё „РАЦЫЯ” і Ваяводскі Асяродак Анімацыі Культуры

запрашаюць на

Канцэрт Алеся КАМОЦКАГА

які адбудзецца 26 лютага 2010 (пятніца) у цэнтры Ваяводскага асяродка анімацыі культуры „Сподкі” па вул. Святога Роха, 14 у Беластоку а гадз. 18.00 (уваход свабодны)

У памяць Чэслава Немэна ☞ 5

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

У снезе... ☞ 8

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

9 770546 196000

Няма палітыкі

Гісторыя пераследу Саюза палякаў Беларусі цягнецца ажно з 2005 года. Усё пачалося з таго, што на чарговым з'ездзе арганізацыі ў выніку дэмакратычных перавыбараў і патаемнага галасавання старшынёй Саюза была абрана Анжаліка Борыс. Ранейшы кіраўнік Тадэвуш Кручкоўскі, які дыскрэдытаваў сябе ў розных праявах як у асяродку палякаў, так і ў мясцовым універсітэце, адыходзіць не захацеў (дакладней, яму не дазволілі зрабіць гэта тыя, хто хоча трымаць у сённяшняй Беларусі ўсё пад кантролем). Паўсталі два „звёнзкі". Але ж фігура Кручкоўскага была занадта „засвечаная" і скампраметаваная. Старшынём „дзяржаўнага" саюза палякаў быў прызначаны пенсіянер Іосіф Лучнік. Апагеем перасследу тады стаў гвалтоўны захоп уладай Дому польскага ў Гродне. З таго часу перманентна ўспыхвалі рознай сілы рэпрэсіі супраць дзеячаў сапраўднага Саюза палякаў у розных формах — канфіскацыя выданняў, ананімныя запалохванні і пагрозы, правакацыі, затрыманні на мяжы, адміністрацыйныя арышты. Нават помнік Чэславу Немэну пацярпеў.

Улада стала ствараць па ўсім заходнім рэгіёне Беларусі свае марыянеткавыя структуры Саюза палякаў. Часта даходзіла да абсурду, калі на праўладныя з'езды збіралі чыноўнікаў з выканкамаў, калі выяўлялася, што „новыя" і „правільныя" палякі не маглі двух слоў звязаць па-польску. Летась небараку Лучніка адпусцілі на пакой, а новым старшынём правільнага саюза быў прызначаны Станіслаў Сямашка, прадпрымальнік з досыць сумнеўнай рэпутацыяй, але затое адданы мясцовай уладзе. Ужо з ягоных першых недарэчных інтэрв'ю стала бачна, што бізнесовец не надта разумее ўвогуле, што такое недзяржаўная арганізацыя, у чым яе сутнасць і чым яна можа займацца.

Прайшло яшчэ колькі часу і канфлікт паміж уладай і непрызнаным Саюзам палякаў абвастрыўся ў Івянцы, што ў Валожынскім раёне. Там да нядаўняга часу знаходзіўся апошні незалежны асяродак палякаў, які не скарыўся ўладзе. Мясцовую кіраўнічку Тарэсу Собаль „прэсавалі" з усіх бакоў — і пагражалі, і крымінальную справу заводзілі. Але яна не здалася і пры відавочнай падтрымцы мясцовых актывістаў засталася на сумленнай пазіцыі. Сямашку ў івянецкі Дом польскі нават не пусцілі. Аднак, цемрашальства ўлады спыніць зараз досыць цяжка. Праз некалькі дзён незалежны будынак быў захоплены гвалтоўна. Шляхоў яго вяртання законным гаспадарам цяпер не засталося.

Для ўсіх разумных людзей відавочныя некалькі рэчаў. Па-першае, тое, што па сутнасці няма двух Саюзаў палякаў у Беларусі. Бо той другі рассыплецца як картачны домік як толькі яго члены перастануць атрымліваць загады і падтрымку з боку дзяржаўных структур. Па-другое, тое, што канфлікт, які існуе, не з'яўляецца канфліктам паміж беларусамі і палякамі, не з'яўляецца міжнацыянальным. Гэта разумеюць і лідары сапраўднага Саюза палякаў Беларусі. На апошні пікет, які адбыўся ў Гродне ля былой сядзібы Саюза палякаў, прыйшлі, акрамя актывістаў польскага дэмакратычнага руху, таксама прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. За вашу і нашу салідарнасць! За вашу і нашу дэмакратычную Беларусь!

Улада даўно выйшла за межы прававога поля, за межы ёй самой усталяванага заканадаўства. Яна проста не можа цярпець аніводнага дэмакратычнага згуртавання, аніводнай грамадскай арганізацыі, якая была б незалежнай. Можна прыгадаць, як яшчэ да перасследу палякаў у Гродне былі зачынены ўсе незалежныя беларускія выданні, як выкідвалі на вуліцу рэдакцыю „Пагоні", як праз суд высялялі з памяшкання арганізацыю БНФ „Адраджэнне" (нібыта, з-за аварыйнасці будынка, але пасля рамонту, аднак, там цудоўна ўладкаваліся камерцыйныя фірмы), як змушалі зачыняцца іншыя зарэгістраваныя недзяржаўныя арганізацыі. Калі са структурызаваным беларускім дэмакратычным рухам было скончана, узяліся за незалежную польскую арганізацыю. Калі б такія былі ўкраінская, ці літоўская, узяліся б і за іх, не сумнявайцеся.

У гэтым працэсе перасследу Саюза палякаў Беларусі ўражвае, але ўжо хіба не здзіўляе, адна з'ява. Тая непаслядоўная палітыка польскай дзяржавы, якая адным голасам гаворыць адно, а іншымі рукамі робіць іншае. Адны выказваюць салідарнасць і робяць заявы, а іншыя спакойна супрацоўнічаюць з тымі ж гарадзенскімі дзяржаўнымі і прыдзяржаўнымі структурамі. Таму можна сцвярджаць, што сапраўднай паслядоўнай палітыкі з боку Польшчы ў гэтым пытанні няма.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

1 ☞ працяг

Шчыра, адкрыта, рашуча?

мовы, хоць „у польскага боку наконт гэтага пытання большы вопыт".

Міністр Сікорскі:

— З-за прыязнасці ў адносінах да суседзяў прабавалі мы гнутка патрактаваць гэтую мяжу з Украінай, значыць, затрымаць яе на 50 кіламетры, але гэта і так было пастаўлена пад сумненне Еўрапейскай камісіяй і ў сувязі з гэтым мелі мы паўгадовае спазненне з ажыццяўленнем той дамовы. Я прапанаваў бы ў гэты раз не камбінаваць, толькі рэалізаваць гэтую дамову ў цяперашнім кшталце, які можа адобрыць ЕК (...). З нашага вопыту ад рэалізацыі такой дамовы з Украінай вынікае, што давядзе яна на некалькімесячны тэрмін да нагрувашчання ў працы розных службаў. У размове з панам міністрам мы вызначылі, што прыгледзімся, ці не трэба будзе павялічыць ліку польскіх консулаў у Беларусі і беларускіх у Польшчы на час выдачы карт малога памежнага руху.

Яшчэ ў час заявы, выказанай пасля падпісання дамовы, міністр Сікорскі адзначыў:

— Польшча падтрымлівае курс Беларусі на ўзмацненне незалежнасці, на дыверсіфікацыю палітыкі. Аднак так, як ЕС, тую падтрымку абумоўліваем тым, каб Беларусь захоўвала прынцыпы арганізацыі, членамі якой з'яўляюцца абедзве нашы краіны, значыць, АБСЕ, а дакладна ідзе тут пра шанаванне правоў апазіцыі і нацыянальных меншасцей.

Адзначыў ужо непасрэдна наконт сітуацыі польскай меншасці:

— Калі гаворка пра гэты дыяпазон спраў, як гэта гаворыцца на мове дыпламатыі, наша размова была шчырая і рашучая. Думаю, што нашы пазіцыі наблізіліся. Спадзяюся, што цяперашняя сітуацыя нашай меншасці не будзе горшай, а нават наадварот, знойдзем спосабы, каб знайсці з яе выхад, каб Польшча магла надалей падтрымліваць еўрапейскія памкненні Беларусі. Гэта альтэрнатыўная палітыка, залежная ад таго, што зробіць сама Беларусь.

У сваю чаргу Сяргей Мартынаў размову са сваім польскім калегам, асабліва ў аспекце польскай меншасці, ацаніў як „шчырую, адкрытую і канструктыўную":

— Мы лічым, што не наступае парушэнне правоў польскай меншасці ў Беларусі. Выступаюць адрозненні паміж двумя фракцыямі польскай арганізацыі. Урад Беларусі не хоча ў гэта ўмешвацца і лічыць, што ўлады абодвух саюзаў павінны самі паміж сабой дайсці да паразумення. Не можам забываць, што польская меншасць у Беларусі з'яўляецца інтэгральнай часткай усяго нашага грамадства і так, як яно цэлае, мусіць прытрымлівацца законаў.

Радаслаў Сікорскі:

— Заклікаем урад Беларусі, каб легальна абраныя ўлады Саюза палякаў Беларусі маглі легальна дзейнічаць, згодна з беларускімі законамі, распаўсюджваць польскую мову і культуру ў адпаведнасці з падпісанымі дамовамі і трактатамі (...). Мы накрэслілі перад панам міністрам заадно пазітыўны сцэнарый нашых адносін, у якім наступіць змена цяперашняй трактоўкі меншасці, як і магчымым з'яўляецца і адмоўны сцэнарый.

У кулуарах, пасля сустрэчы абодвух міністраў, разышлася інфармацыя, што міністр Сікорскі перадаў на рукі міністра Мартынава ліст з дзесяці пунктаў прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку, пагражаючы рэстрыкцыямі ў выпадку далейшага парушэння правоў польскай меншасці.

У час прэс-канферэнцыі шэф беларускай дыпламатыі яшчэ раз гаварыў аб выконванні беларускіх законаў, калі адказваў на пытанні журналіста БелСата ў справе рэгістрацыі гэтай тэлестанцыі ў Беларусі і пакарання дзесяцідзённым арыштам яе журналіста Івана Шульгі (звольненага дзень пазней).

— Я заахвочваю да рэгістрацыі тэлебачання БелСат, — сказаў міністр Сікорскі. — Рэгістрацыя вольных СМІ будзе для Беларусі найлепшай легітымнасцю дэмакратычных перамен.

Міністр Мартынаў прачытаў таксама лекцыю аб беларускай замежнай палітыцы і польска-беларускіх адносінах у Прымасаўскім палацы і тут удзельнічаў у кароткай дыскусіі. Сустрэчу сарганізаваў Польскі інстытут міжнародных спраў пры саўдзеле пасольства РБ у Польшчы. Справаздача — праз тыдзень.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

PS. У момант, калі мы здавалі нумар у друк, беларуская міліцыя затрымала 40 дзеячаў СПБ, між іншым Анжаліку Борыс.

Вачыма еўрапейца

Адышоў міністр Скубішэўскі

Быў дасціпны, вельмі сімпатычны і прытым разважны, а калі трэба было — непахісна ўпэўнены. Так аб памерлым на мінулым тыдні Кшыштафе Скубішэўскім (1926 г. нар.) гаворыць ведаючыя яго ўдзельнікі польскай палітычнай сцэны розных фармацый. Сустрэўся я з ім (службова) толькі на хвіліну двойчы, калі на пачатку дзевяностых супрацоўнічаў з інфармацыйнымі праграмамі Польскага тэлебачання. Тады ў журналісцкіх колах Варшавы гаварылі на яго „Скубі". Называлі так таго міністра замежных спраў (1989-1993) нават такія чаляднікі журналістыкі як я, а тады мне было дваццаць з лішнім гадоў. У мянушцы „Скубі" было штосьці цёплага, быццам бы мы да яго ставіліся не толькі як да шэфа польскай дыпламатыі, але і як да нашага дзедкі, якому належацца асаблівая павага і пашана. У тыя часы прадстаўляў ён пяць урадаў, якія асацыяваліся якраз з толькі што здабытай суверэннасцю Польшчы, асабліва ўрад Тадэвуша Мазавецкага, які ўпершыню паклікаў яго ў кабінет міністраў. У прынцыпе ў час знаходжання яго на пасадзе міністра высветлілася наколькі тая суверэннасць будзе поўная і як будзе ўпісвацца ў сітуацыю асабліва ў кантэксце сітуацыі ўсходніх і заходняга суседзяў. Праз гады Кшыштаф Скубішэўскі гаварыў:

— Міхаіл Гарбачоў адыграў першапланавую ролю сваім рашэннем, каб у 1989 годзе не інтэрвеніяваць у Польшчы збройна. Калі б СССР кіраваў яшчэ Леанід Брэжнеў і яго наследнікі, мелі б мы вайсковую інтэрвенцыю. Гарбачова намаўлялі да яе Эрых Гонекер (ГДР) ды Нікалае Чаўшэску (Румынія) (...). Замежная палітыка ўрада Мазавецкага заключалася ў выхадзе з палітычнага спадарожніцтва Савецкаму Саюзу, у нармалізацыі стасункаў з суседзямі і ў мацаванні сувязей з Захадам. Мела быць гэта паступовае дзеянне.

Гэта менавіта Кшыштаф Скубішэўскі даў пачатак стасункам Польшчы з Беларуссю, якая якраз здабывала незалежнасць пасля развалу СССР у снежні 1991 г. Пасля так успамінаў гэты момант гісторыі:

— Ліквідацыя СССР была вельмі карыснай для Польшчы — здабывалі мы трох новых суседзяў на Усходзе, а з Расіяй межавалі толькі праз Калінінградскую вобласць. Яшчэ перад роспускам СССР не найлепш ішло нам з Украінай. З Літвой былі таксама праблемы, паколькі патрабавала яна слоў прабачэння за захоп Вільні ў 1920 годзе генералам Люцыянам Жалігоўскім (што я рашуча адхіляў), а мы мелі сур'ёзныя засцярогі наконт трактавання палякаў у Літве.

Несумненна гэта таксама заслуга Кшыштафа Скубішэўскага, што ў гады дэмакратычных перамен пачатку дзевяностых паправіліся адносіны нашай дзяржавы з Літвой і Украінай ды, хоць памалу, папраўляюцца стасункі з Расіяй („з Расіяй трэба весці дыялог, паказваць, што і Польшча з'яўляецца таксама партнёрам, а не толькі некалькі вялікіх суседніх дзяржаў", — гаварыў яшчэ паўгода таму ў адным з інтэрв'ю).

Яго наследнікі так яго ўспамінаюць. Дарыюш Расаці:

— Карыстаўся ён вялікай павагай па прычыне прафесійнай пазіцыі і асабістай культуры.

Адам Ротфельд:

— Быў сведчаннем, што змена, якая наступіла пасля 1989 г., была фундаментальнай зменай.

Радаслаў Сікорскі:

— Быў ён адначасова кансерватарам і сучасным палітыкам. Трымаўся прынцыпаў.

Такога чалавека Польшчы хапаць не будзе, а іншых, падобных яму, у польскай палітыцы засталося няшмат.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Нурэцкія „Незабудкі”

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Ёзік Грушэўскі, Надзея Карчэўская, Оля Філоц, Антаніна Грушэўская, Марыя Шпанская, Галіна Пытэль, Каміль Пытэль

Раз моцна свяціла жнівенськае сонца, раз разгуляўся праліўны дождж. Гэта было ў Машчонай-Панскай, куды на свята вёскі прыехалі госці не толькі з Нурэцкай гміны. А гэта якраз яны прывезлі сонца: незабудачкі-цётачкі, якія адважыліся паспрачацца за сваё ў гмінным доме культуры ў Нурцы-Станцыі і выступіць як самастойны ансамбль з улюбёнымі песнямі. Праўда, не трэба было ім спрачацца з Ірэнай Яношук, якая заўжды іх падтрымае. У нурэцкім доме культуры перш збіраўся вялікі калектыў, дзе пераважала пенсіянерская брацця. Ім больш даспадобы былі велічныя патрыятычныя песні і розныя паненэчкі, што ішлі ў лясэчак. І сталі „Незабудкі”. І жанчыны, якіх выпадкова ўдалося... мне ахрысціць больш за два гады таму ў Машчонай-Панскай, калі мы першы раз спаткаліся, ад той пары адважна і гожа выступаюць на розных мерапрыемствах, а нават самі ладзяць фэсты-забавы для акалічных вёсак, а нават і ў суседняй, Мілейчыцкай гміне. Гэтак было ў Рагачах, адкуль родам вядучая гурт Надзея Карчэўская. Жыве яна ўжо дванаццаць гадоў у Жэрчычах. Выступае яшчэ з імі Марыся Шпанская, яе дачка, з Нурца-Станцыі, і жанчыны з блізкага Залесся — Оля Філоц, каталічка Галіна Пытэль, Ніна Якімюк, і з Забалоцця — Антаніна Грушэўская. А на гармоніку стаў ім падыгрываць Антон Капялько з Радзівілаўкі, гарманіст з капэлы „Рэтра”. Жвавей з ім, а тое што спяваюць ды іграюць ніякае не „рэтра”. Іграюць тое, што ў душы ім іграе — песні беларускія, паляшуцкія, рускія, а і ад польскай не адмовяцца. Гэтак, як усе нашы людзі, і песні ў іх тыя ўсе — свае. А тыя „Незабудкі” — якраз ад таго. Надзея Карчэўская сказала тады, у летні дзень у праваслаўнай вёсцы сем кіламетраў ад Сямятыч: „Мы не забываем і не забудзем”. Ад таго і тыя „Незабудкі”. І выступілі яны нядаўна ў гонар усяе Нурэцкае гміны: калі праспявалі на цэнтральным аглядзе фестывалю „Беларуская песня 2010”, пачаліся авацыі: „Жыве Нурэц!”

— Я аж здзівілася, калі падыходзілі да нас незнаёмыя людзі ды віншавалі нас і ўсю нашу гміну, — успамінае Надзея свой апошні выступ на фестывалі беларускай песні разам з ансамблем. Бо раней была салісткай, з Сямятыцкага павета. І беларуская песня для яе родная і блізкая.

У Нурэцкай гміне з амаль 5 тысяч чалавек беларусамі запісалася 13,36% насельніцтва. Паводле статыстыкі мужчын тут больш чым жанчын, а лясы займаюць палову зямлі. Пачынаецца яна сто кіламетраў на поўдзень ад Беластока, а сталіца гміны рспаложана ў 20 км ад павятовага горада. А якія гожыя, свойскія назвы ў мясцовасцей: Аўгустынка, Барысоўшчына, Ханіхурсы, Клюковічы, Клюковічы-Калёнія, Літвінавічы, Машчона-Панская, Нурчык, Нурэц-Калёнія, Нурэц-Станцыя, Сакулі, Стаўбцы, Сычы, Тымянка, Вэрпаль, Волька-Нурэцкая, Вычулкі і тыя Забалоцце, Залессе ды Жэрчычы, адкуль збіраюцца ў Нурцы на рэпетыцыі жанчыны з „Незабудак”. Вядомая гісторыя гэтай зямлі сягае XV і XVI стагоддзяў, калі ўласнікамі яе былі панства Клюковіцкія і Нурэцкія. А ўся зямля асацыюецца са Святой Гарой Грабаркай ды манастыром святых Марыі і Марты. У Жэрчычах, 13 км ад Грабаркі, — царква святога Дзмітрыя Салунскага, мураваная, з 1869 года. І драўляная на могільніку — мучаніц Веры, Надзеі і Любові. А ўзнікненне праваслаўнага прыхода, паводле архіваў, адбылося ў 1001 годзе. Была там яшчэ і Жэрчыцкая пушча, якую пазней называлі Мельніцкай...

Дабіраюся ў Жэрчычы на двух аўтобусах раз па расчышчанай да чарнізны асфальту дарозе, пасля сцежкамі паміж гурбаў снегу да паўакна. З нейкім хваляваннем мінаю вёскі, дзе „жыве” шмат герояў маіх вершаў пра тутэйшыя жывёлкі. І гэта мясцовасці, куды „Ніве” часам доўга не было па дарозе. Боцькаўская гміна, Мілейчыцкая, Нурэцкая. Гістарычныя назвы адгукаюцца ў старых легендах... Першыя звесткі пералічваюць назву Жэрчычы (тады яшчэ Жэрдчычы) як вайсковы пастарунак абараняючы галоўны град — Мельнік. Пачатак дала ім збройная дружына кіеўскага князя, якая білася тут з яцвягамі. Правадыр яцвягаў (праўдападобна імя ягонае было Краўс) загінуў у няроўнай барацьбе разам са сваімі ваярамі. Кіеўскія дружыннікі, у пашане геройскай смерці праціўнікаў, рашылі пахаваць іх з гонарам. Сабралі целы пабітых і разам з коньмі і зброяй спалілі, каб шляхетныя косці ваяраў не развалок драпежны звер. Попелу не рассыпалі на вецер, а ўсыпалі над імі высокі курган. Ён за рэчкай, з правага боку, калі ехаць у Забалоцце. У 1944 годзе былі там пастаўлены тры крыжы. Успамінаецца ікона Ціхвінскай Божай Маці. Загінула яна ў агні 22 ліпеня 1944 года, а існавала ў Жэрчычах ад 1654 года. Пачаткі яе малавядомыя. Была яна знойдзена на кургане, на якім была драўляная, крытая саломай каплічка. Заходзіў у яе хто хацеў і клаў сваю сціплую ахвяру. Ды палакоміўся на тыя ахвяры адзін чалавек, за што знямог ад паралічу. Ляжаў як калода. Левай рукой даў знак, каб паклікалі духоўнага, і паказаў яму знакамі, што благога ўчыніў. Вярнуў грошы, а было гэтага 38 рублёў 42 капейкі срэбрам. Паяднаўшыся з Богам, праз два дні памёр. А ікону перанеслі ў вялікую царкву за алтар. Гэта было ўжо пры ўніі. Ікона атрымала рызу і карону і была змешчана ў кіоце. Аздобы і каштоўнасці былі выкарыстаны як сродкі на мураваны храм. Год 1654 быў годам гістарычнай спробы. Адзін са шведаў стрэліў у ікону. Порах разарваў дула, выпаліў яму вочы і ён у пакуце паклікаў дапамогі Уладычыцы. Праз нейкі час вярнуўся яму зрок. Не адышоў ад Жэрчыч, застаўся сторажам у царкве. Усе вераць, што вернецца святасць, неяк адновіцца цудам, бо не адзін цуд быў у яе гісторыі...

Наконт цудаў, дык хоць яны трапляюцца, „дык цудаў няма”. Трэба цуду памагчы і апынуцца ў адпаведным часе і ў адпаведным месцы. Надзея, знакамітая краўчыха і весялуха, хоць выпакутаваная ад хвароб і няшчасцяў, не паддалася.

— Даў мне на старасць Бог лепшае здароўе, добрую памяць і крыху талентаў. Нельга ж закопваць сваіх умеласцей і магчымасцей, як той благі слуга свой талент, у зямлю. Рашыла я паварушыцца, — усміхаецца Надзея. Сабрала яна сёння амаль увесь свой калектыў у хаце — яны ледзь дабраліся ў марозны адвячорак у Жэрчычы, і нават апрануліся ў каляровыя строі, якія ім запраектавала і пашыла сяброўка-кіраўнічка. — Апынулася я ў Жэрчычах. І захацелася мне знайсці падобных мне. Села на ровар і паехала ў Залессе, да Ніны Якімюк. І рушыліся мы ўсе разам, пры падтрымцы Ірэны Яношук. Дзякуем і вам — тады вы і „Ніва” паддалі нам духу! І мы ахвотна сталі выступаць. Спачатку ў сваёй гміне, у павеце, а пасля і далей. Паехалі мы ў Нараўку — узялі трэцюю ўзнагароду. А цяпер, на фестывалі беларускай песні, нас вылучылі. Выступаем і на аглядах калядак, і на экуменічных мерапрыемствах сакральнай песні. Варта нам будзе паказацца і ў ... Аглядзе фрывольнай песні ў Чорнай-Беластоцкай. Не адной тужлівай песняй жывём, гаротніцы-беларусачкі!

У хату заглянуў Ёзік Грушэўскі, муж Антаніны: „Ёзік, заўтра гуляем на запустах у Нурцы! Бо ж сем тыдняў посту!!!” Вясёлы Ёзік не супраць. Пасля па маму заедзе Каміль Пытэль — пазнавата, над заснежанай жэрчыцкай вуліцай загарэліся ўжо лямпы. Прыедзе ён з вялікім сэрцам з бярозавага вецця: залесянскія і навакольныя жыхары — майстры ў выплятанні розных цудаў з галінак. Едуць тыя сэрцы нават за мяжу. І зелем лячэбным стаіць ваколіца — усе збіраюць, сушаць. Трэба ж жыць.

А яны спяваюць, і песні доўгія, здавалася б, без канца: „Хораша ў чыстым полі...”, „Шаснаццаць лет дзяўчоначке”, „Эта было летам у Ленінградзе”, „Стой, бяроза, не шатайся..” „Ой, у лузі пры долінi...” Колькі сардэчнасці, жалю і тугі... І вясёлыя, ёсць нават у меру прыкольныя... Калі не ведаюць слоў, дапісваюць новыя. Або мяняюць заканчэнне — каб весялей было, больш аптымістычна. Вось гэта і ёсць народная творчасць! Асабліва ўдаецца гэта Надзеі. І ў яе вершыку — пасвойму, ці то руская, ці беларуская, ці ўкраінская, ці яшчэ якая песня. Яе варыянт — уласны. Тутэйшы.

Неадпаведнае параўнанне

„Зусім як той Сталін" — пад такім загалоўкам у „Ніве" № 6 ад 7.02.2010 г. апублікаваў сваю карэспандэнцыю Мікалай Лук'янюк з вёскі Бялкі Нарваўскай гміны. На маю думку параўнанне старшыні БГКТ са Сталіным цалкам неадпаведнае. Наконт з'езда БГКТ, які адбыўся 20 снежня 2009 г. у Беластоку, былі апублікаваны артыкулы і заўвагі да справаздачы старшыні БГКТ Янкі Сычэўскага. І няхай кожны па-свойму ацэньвае тое, што прачытаў ці пачуў.

Старшыня Сычэўскі не такі „зусім як той Сталін". Чаму? А таму, што людзям ва ўсім свеце вядома кім быў Сталін у Савецкім Саюзе. Пры панаванні гэтага палача мільёны людзей загінулі ў турмах і лагерах Калымы, Архангельска, Сібіры, Катыні і іншых месцах невядомых нам па сённяшні дзень. Знішчыў ён высокаадукаваных людзей і такім чынам асіраціў багатую ў той час Расію, пазбавіў яе грамадства навуковага і творчага патэнцыялу. Ахвяры рэпрэсій спяць вечным сном невядома дзе, а родныя да сённяшняга дня выплакалі мора слёз па сваіх блізкіх. Дзесьці пад Архангельскам таксама засталіся косці майго дзядзькі Гаўрыіла Лаўрашука — настаўніка фізікі, які выкладаў у Маскве і Падмаскоўі. Невінаватага ў нічым чалавека рэабілітавалі шмат гадоў пасля смерці ў лагеры — у мяне ёсць на гэта дакументы.

Ва ўсім свеце няма такога чалавека, якога можна параўнаць са Сталіным. Відаць, карэспандэнту з Бялкоў не хапіла гістарычнай памяці і прамахнуўся ён у сваім параўнанні.

Віктар БУРА

Жанчыны просяць за жанчыну

З нагоды 100-гадовага юбілею славутай беларускай пісьменніцы Ларысы Геніюш, які адзначаецца ў гэтым годзе, прадстаўніцы беларускай суполкі „Скарына" (Прага, Чэхія) — Рыта Гаціх, Алена Каварава — 5 лютага звярнуліся з сімвалічнай просьбай да міністра юстыцыі Чэшскай Рэспублікі Даніэлы Каваравай.

Беларускія жанчыны просяць спадарыню міністр рэабілітаваць Ларысу Геніюш, якая па загадзе КДБ была выдадзена савецкім уладам як ваенны злачынца, і патлумачыць працэдуру магчымых дзеянняў па рэабілітацыі згодна з чэшскім заканадаўствам. Заява была прыхільна сустрэта спадаром Росыпалем, памочнікам Даніэлы Каваравай.

„Наша ідэя ў тым, што жанчыны прыйшлі прасіць жанчыну за жанчыну, — гаворыць старшыня суполкі „Скарына" Рыта Гаціх. — Спадзяемся, што як жанчына спадарыня Каварава станоўча паставіцца да нашай просьбы".

Акрамя таго, беларусы Чэхіі плануюць да юбілею пісьменніцы ўсталяваць памятную дошку ў яе гонар на будынку, у якім Ларыса Геніюш пражывала падчас свайго легальнага знаходжання ў Чэхаславацкай Рэспубліцы. Неўзабаве будзе абвешчаны конкурс на праект гэтай дошкі. У дадзены момант сябрамі нядаўна створанага ў Мінску арганізацыйнага камітэта па святкаванні 100-годдзя з дня нараджэння Ларысы Геніюш узгадняецца тэкст, які будзе напісаны на мемарыяльнай дошцы. Арганізацыйную дамапогу ў рэалізацыі праекта па ўсталяванні памятнай дошкі Ларысе Геніюш аказвае МГА „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»".

Інфармацыйны цэнтр МГА „ЗБС «Бацькаўшчына»"

Расспяваныя Рыбалы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Мяшаная група з Рыбалаў запрэзентавалася ўдала

Вакальныя і абрадавыя народныя традыцыі пераказваліся ў Рыбалах і навакольлі здаўна, з пакалення ў пакаленне. Найбольш вядомымі рыбалаўскімі спевакамі, пра якіх многа пісалася і гаварылася, быў калектыў „Хлопцы-рыбалоўцы". Калі спынілі яны сваю дзейнасць, з беларускім рэпертуарам працягваюць выступаць школьнікі пад наглядам кіраўніка вясковай святліцы Лідзіі Мартынюк. У жніўні мінулага года ў Рыбалах аднавіўся беларускі калектыў дарослых спевакоў. Жыхары гэтага сяла сталі сустракацца на рэпетыцыях і выступаць на мясцовых мерапрыемствах. Вясковыя жанчыны выступаюць таксама разам з моладдзю, са сваймі дзяцьмі. Так было між іншым у час прэзентацыі народных абрадаў у Гайнаўцы, калі рыбалаўская група паказала „Гоготуху". Мяшаная група з Рыбалаў выступіла таксама на вечарыне „Зімовыя сустрэчы з песняй", якая 6 лютага ладзілася ў іх вясковай святліцы Гарадскім асяродкам анімацыі культуры з Заблудава, а ў асноўным кіраўніком гэтай жа святліцы Лідзіяй Мартынюк. Гэта быў апошні час, калі можна было яшчэ спяваць калядкі і таму калядавала большасць выступаючых. Аднак у час сустрэчы, на якой сабралася многа жыхароў Рыбалаў і навакольных вёсак, а сярод якіх былі намеснік заблудаўскага бурмістра Міраслаў Максімюк, старшыня Заблудаўскай рады Ян Лех Валасэвіч і мясцовыя радныя, калектывы выступілі ў галоўным з народнымі даўнімі творамі і апрацаваным беларускім фальклорам.

Мяшаная група з Рыбалаў, што выступала першай, пачала спяваць нясмела, але пасля набрала адвагі. Ужо па касцюмах было відаць, што на сцэну да супольнага спеву выйшлі два калектывы — малодшы і старэйшы. Як на малады калектыў, запрэзентаваліся яны ўдала.

— Мы выступаем найчасцей на мясцовых мерапрыемствах, а да дажынак рыхтаваліся разам з нанятым на кароткі час інструктарам Марыюшам Харужым. Зімой спявалі мы калядкі ў Беластоку, а раней выступалі ў Гайнаўцы. На рэпетыцыі прыходзіла больш асоб, але зараз у старэйшым калектыве спявае ў сярэднім 6 асоб. Ад моладзі на супольныя рэпетыцыі прыходзіць 4-5 асоб, — расказвае Дарота Ганацкая з Рыбалаў. — Спачатку хадзіў да нас Пётр Мартынюк, што спяваў яшчэ ў „Хлопцах-рыбалоўцах", але зараз не спявае з намі. Многа мужчын з нашага славутага калектыву паўмірала ўжо, але некаторыя яшчэ жывуць у Рыбалах і навакольных сёлах.

— Мы любім спяваць і нам хочацца выступаць, — заяўляе Рэгіна Максімюк. — Я, напрыклад, за дочкамі Івонай і Агатай прыйшла ў калектыў, бо яны раней займаліся ў святліцы і выступалі з беларускімі песнямі.

Дачка спадарыні Дароты Ганацкай, Юстына, таксама спявае ў мяшаным калектыве. Жанчыны кажуць, што ў іх вакальнай групе выступае яшчэ адно сямейства, Сільвія Мартынюк і яе муж Пётр. Прапанова сарганізаваць калектыў выйшла ад кіраўніка святліцы Лідзіі Мартынюк, але доўга не трэба было намаўляць мясцовых да заснавання вакальнай групы.

— У Рыбалах ёсць людзі да спеву і можна сабраць ахвотных на тры калектывы, наймалодшыя і старэйшыя, але патрэбны прафесійны інструктар, які займаўся б з намі. Я рыхтавала да выступаў з песнямі дзетак і моладзь, але яны амаль умеюць ужо тое, што і я. Прасіла я ў Гміннай установе ў Заблудаве, каб далі сродкі наняць інструктара і тлумачыла, што ў нас беларускі спеў — складаны, на некалькі галасоў. Аднак раней не атрымала згоды на пастаянную фінансавую дапамогу, — сказала кіраўнік святліцы Лідзія Мартынюк. — У час ладжанай пажарнікамі сустрэчы маладыя хлопцы самі запрапанавалі мне, каб арганізаваць мужчынскі калектыў падобны на „Хлопцаў-рыбалоўцаў". Яны ёсць яшчэ пад уражаннем нашай славутай мужчынскай групы і хацелі б падтрымаць традыцыю. Патрэбны нам таксама сапраўдны музыкант. Напісалі мы такса афіцыйнае прашэнне ў Гмінную ўстанову ў справе інструктара, музыканта і чакаем адказу.

Залу запоўнілі ў асноўным старэйшыя людзі

Дзяўчаты, што спяваюць у мяшанай групе, раней доўга займаліся ў вясковай святліцы пад наглядам кіраўніка Лідзіі Мартынюк.

— Мы беларускай мове вучыліся толькі ў падставовай школе ў Рыбалах. Калі яе закрылі і нас пачалі давозіць у школу ў Заблудаў, мы ўжо не ходзім на заняткі беларускай мовы. Аднак дома размаўляем яшчэ па-свойму, перад усім з бабулямі і дзядулямі, а беларускі рэпертуар рыхтуем у святліцы, займаючыся тут ад трэцяга класа падставовай школы. Выступалі мы ўжо з беларускімі песнямі, вершыкамі і тэатральнымі прадстаўленнямі, а цяпер часта выступаем разам са старэйшымі, — кажуць Юстына Давідзюк і Івона Максімюк. — У нашым рэпертуары ёсць і даўнейшыя песні, але лепш мы спраўляемся з апрацаваным фальклорам.

Асобна з беларускім рэпертуарам займаюцца ў вясковай святліцы наймалодшыя дзеткі і спадарыня Лідзія надалей рыхтуе іх да конкурсаў. Вельмі хацелі закалядаваць дзве рыбалаўскія дзяўчынкі і спадарыня Лідзія згадзілася на іх выступ. Дзяўчаткі адважна заспявалі і вельмі радаваліся, што маглі запрэзентавацца перад вялікай публікай. Калі пачала выступаць Студыя аўтэнтычнага беларускага фальклору „АБ-БА", некалькігадовая дзяўчынка, што сядзела з бацькам у першым радзе, пачала нервавацца. Хацела спяваць разам з мамай у беластоцкім калектыве. Пазней дабілася свайго і падспеўвала стоячы побач мамы на сцэне. Студыя беларускага фальклору на высокім узроўні запрэзентавала даўнія песні, сярод якіх было таксама крыху калядак. У падобным стылі выступіла „Жэмэрва", але іх спеў заўважальна адрозніваўся ад выканання народных твораў беластоцкімі спевакамі. Студзіводскі калектыў распачаў свой выступ са сцэнкі калядавання маладажонам, а пасля займальна прэзентаваў даўнія песні запісаныя на Бельшчыне і Гайнаўшчыне. Апошнім выступіў калектыў „Хутар" з Гарадка, які ўдала запрэзентаваў меладычны спеў. Паколькі рыбалаўскае мерапрыемства было спалучана з вясковымі запустамі, пасля выступаў на сцэне можна было ў вялікай кампаніі паспрабаваць, між іншым, мясцовых страў, падрыхтаваных паводле даўніх рэцэптаў.

На фотавыстаўцы традыцыйных выцінанак, што была наладжана Падляшскім музеем і запрэзентавана мясцоваму насельніцтву першы раз у час мерапрыемства, можна было ўбачыць таксама і рыбалаўскія выцінанкі, якімі абклеена была звязда. Былі яны выкананы паводле старых узораў.

— Можа нашу звязду з выцінанкамі сфатаграфавалі ў час аглядаў калядуючых калектываў або ў нас, у рыбалаўскай царкве, — разважала спадарыня Лідзія Мартынюк. Вясковая звязда красавалася таксама ў рыбалаўскай святліцы ў час выступаў з даўнімі мясцовымі калядкамі, згодна нашым традыцыям.

Вельмі добра, што ў Рыбалах можна паслухаць свае песні, паглядзець мясцовыя абрады і пасмакаваць сваё харчаванне. „Жэмэрва" выступіла ў мясцовай вопратцы з Бельшчыны. У рыбалаўскім музеі „Бацькаўшчына" экспануецца жаночая і мужчынская вопратка, сабраная ў Рыбалаўскім прыходзе. Можна было б пашыць касцюмы новастворанаму калектыву менавіта паводле мясцовых узораў.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

У памяць Чэслава Немэна

Арганізатар канцэрта генконсул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык з выканаўцамі

Канцэрт аркестра эстраднай музыкі „Капрыз" Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і заслужаных артыстаў Беларусі, між іншым зоркі беларускай эстрады Пятра Ялфімава ды паказ дакументальных фільмаў у рэжысуры беларускі Веры Савінай і паляка Яўгена Шпакоўскага склалі вечар памяці Чэслава Немэна.

— Імя Чэслава Немэна вядомае ў Беларусі штораз лепш. Гэта вечныя песні, — пасля сказала спявачка Святлана Дзякун, падобна як іншыя ўдзельнікі вечара.

Сустрэча ў актавай зале Універсітэцкай бібліятэкі імя Ежы Гедройца ў Беластоку сабрала тлумы. Арганізатарамі вечарыны былі Генеральнае консульства РБ у Беластоку а таксама ўніверсітэты ў Беластоку і Гродне. Генконсул Міхал Аляксейчык вітаў фанатаў народжанага ў Старых Васілішках у Беларусі, а ўсё далейшае жыццё (пасля 19 года) пражываючага ў Польшчы маэстра шырока разуметай эстраднай музыкі:

— Чэслаў Немэн гэта быў музыка маёй маладосці. Раскрыў ён нам далягляды на музычны свет.

У размове з журналістамі генконсул прызнаўся, што для арганізацыі гэтай вечарыны намовілі яго працаўнікі Гродзенскага ўніверсітэта (у гэтай вучэльні ўзнікла нават навуковая праца, прысвечаная мастаку), а пасля Яўген Шпакоўскі, „зацікаўлены праблемай рэстаўрацыі сямейнага дома артыста":

— Летась мінула сямідзесятая гадавіна нараджэння Немэна. Трохі мы яе праваронілі. Таму рашылі мы яшчэ сёлета, перад чарговай гадавінай, сарганізаваць такі вечар якраз у Беластоку ва ўніверсітэце, паколькі гродзенская і беластоцкая вучэльні маюць ужо падпісаную дамову аб супрацоўніцтве. Такія сустрэчы даюць магчымасць узаемнага паразумення, без падзелаў на тое што ваша, а што наша. І гэта было галоўнай мэтай арганізацыі гэтага вечара.

Дадаў:

— Немэн выйшаў з беларускай вёскі, а пасля стаў музыкантам вядомым амаль ва ўсім свеце. З нараджэння быў беларусам, польскай нацыянальнасці. Калі паміраў, сказаў: „Jestem Białorusinem". Немэн прыцягвае да сябе заадно палякаў, як і беларусаў.

Падобны канцэрт, у пашыранай формуле, мае адбыцца ў Гродне. Генконсул Аляксейчык:

— Пасля такіх падзей можа лягчэй будзе размаўляць з уладай аб аднаўленні дома Немэна ў Васілішках, аб паскарэнні яго адбудовы. Тым больш, што польскі бок абяцаў, што на гэтую мэту будуць прыцягнуты сродкі таксама з Еўрасаюза.

У музычнай частцы з акампанементам першага ў Беларусі акадэмічнага жаночага джаз-банда „Капрыз" артысты звязаныя з гэтай капэлай праспявалі папулярныя і менш папулярныя нават у Польшчы творы маэстра Немэна. І так м.інш. у выкананні Святланы Дзякун выслухалі мы гітоў „Pod papugami", „Płonie stodoła" ці „Mów do mnie jeszcze", а напр. Алена Стэльмах праспявала „Pamiętam ten dzień". Несумненна, зоркай вечара стаў прадстаўнік Беларусі ў час апошняга фестывалю „Еўрабачання" Пётр Ялфімаў. У белым скураным касцюме з вялікай дозай лірыкі выканаў ён „Nim przyjdzie wiosna". У сваю чаргу завяршаючая музычную частку незвычайна экспрэсіўная інтэрпрэтацыя песні „Dziwny jest ten świat" выклікала сярод публікі авацыі. Пасля канцэрта ў размове з „Нівай" спявак расказаў, што яго захапіла ў творчасці Чэслава Немэна:

— Гэта не толькі музыка, але поўная гармонія: музыкі, вершаў, думак, яго перажыванняў таго, што нас акаляе. Гэта шчырая творчасць, да якой таксама я, так як і ён, хачу імкнуцца. Калі забудзем аб тым, што мы ў першую чаргу людзі, якія мусяць напаўняцца любоўю, усё канчаецца. Асновай чалавека з'яўляецца ён сам і яго духоўнасць, і думаю, што і Чэслаў Немэн быў такой думкі.

Адзначыў:

— Не ўмею сказаць, наколькі Немэн папулярны ў Беларусі. Але ў музычным свеце гэтага чалавека ведаюць, любяць, памятаюць аб ім як музыку, спеваку і кампазітары, а нават, як у творчасці яго сябра Уладзіміра Мулявіна — бачны ўплывы Немэна. Усе тыя сапраўдныя музыкі, якія яшчэ сёння ёсць у Беларусі, ведаюць яго, памятаюць і кахаюць. Я не магу прылічыць сябе ўжо да маладых выканаўцаў, але і не да зусім спелых. Выконваючы творы Немэна, бачу рэакцыю маладых людзей і ім гэтая музыка падабаецца. Наступае такая тэндэнцыя, не толькі ў Беларусі: людзі стомленыя ад штораз больш дурной, бяздумнай, аднадзённай музыкі, хочуць сапраўднай, а такой з'яўляецца творчасць Чэслава Немэна.

Расказваў:

— З яго творчасцю я пазнаёміўся зусім нядаўна: у 2004 годзе і цалкам яна перакуліла маё асабістае светабачанне таксама як і музыканта. У час міжнароднага фестывалю эстраднай песні „Славянскі базар" у Віцебску [калісь быў гэта фестываль польскай песні — М. Х.] як прадстаўнік Беларусі за песню „Dziwny jest ten świat" атрымаў я Гран-пры. Раней, пачуўшы, як я спяваю і прыглядаючыся маёй энергіі, да азнаямлення з творчасцю Немэна намовіў мяне знакаміты беларускі кампазітар Аляксей Васіленка. І меў рацыю. Я думаю, што няшмат часу міне, калі маладыя людзі, якія сёння слухаюць на маіх канцэртах творы Чэслава Немэна, перададуць гэтае захапленне сваім дзецям.

Папулярны беларускі аранжыроўшчык Уладзімір Ткачэнка, які дапамагаў у падрыхтоўцы твораў Чэслава Немэна ансамблю „Капрыз", сказаў нам:

— Першапачатковых аранжыровак выконваных Чэславам Немэнам я стараўся не чапаць. Яны не састарэліся, не адчуваецца мною, каб гэта была нейкая музыка рэтра. З новымі аранжыроўкамі можна было б з гэтай музыкі шмат што страціць. Не толькі музыка Чэслава Немэна, але і ўся польская эстрадная музыка шасцідзесятых гадоў была той, на якой я вучыўся. Вядома, найперш былі „Бітлз", але зараз пасля „No To Co", „Czerwone Gitary", Марыля Радовіч, ну і Чэслаў Немэн. Гэта мае настаўнікі. У Чэслава Немэна прыцягвала мяне „сур'ёзнасць" яго музыкі. Гэта чалавек, які чагосьці свайго ў музыцы шукаў і знаходзіў, а не толькі працаваў, каб зарабіць грошы.

У размове з „Нівай" аўтарка фільма, прысвечанага Чэславу Немэну, якога прэм'ера адбылася ў канцы лістапада мінулага года, Вера Савіна, прызналася:

— У гэтага фільма свая перадгісторыя. У 1976 годзе, пасля канцэрта Чэслава Немэна ў мінскім Палацы спорту, я правяла з ім інтэрв'ю. У фільме, дарэчы, паказваюцца чатыры фатаграфіі з таго спаткання: два яго партрэты, ён на сцэне і я з ім. У ніякай з цэнтральных газет не хацелі апублікаваць гэтага інтэрв'ю, бо тады ў Беларусі трактавалі Немэна як чалавека, які пакінуў Бацькаўшчыну. Цяпер, калі рашыла я паставіць гэты фільм, гэта быў імпульс: я дзесьці штосьці пачула, прыгадала хоць бы тое інтэрв'ю.

Адзначыла:

— Немэн гэта перш за ўсё вялікі музыкант, пазбаўлены гэтых усіх рыс, якія сёння звязаны з шоў-бізнесам. Мы паставілі дакументальны фільм аб вялікім чалавеку, які ўсё жыццё кахаў краіну, з якой выводзіўся. Факт, што стаў вялікім музыкантам, у фільме толькі сцвярджаем.

Расказвае з хваляваннем:

— Калі я была ў Васілішках і ўбачыла ягоны дом і дарогу, вядучую з яго да касцёла, падумала, што якраз касцёл быў яго духоўнай падтрымкай. Можа таму ў яго творчасці ёсць такая шчырасць і адкрытасць пачуццяў, якая можа быць толькі ў сапраўды веруючага чалавека.

Пасля вечара слухачы і гледачы не хавалі свайго хвалявання. Аднаго толькі — аб чым гаварылі выходзіўшы — шкадавалі, што не быў праведзены ў іншым месцы (тэатры, філармоніі?), якое падкрэсліла б атмасферу ўспамінаў.

Лыжны прабег у гонар Каліноўскага

7 лютага Беларуская нацыянальная памяць правяла лыжны прабег у гонар Кастуся Каліноўскага. Шлях пралягаў праз родныя мясціны нашага нацыянальнага героя.

Мэтай і канцавым пунктам прабегу стала вёска Мастаўляны, дзе 2 лютага 1838 года нарадзіўся Кастусь Каліноўскі. Тут ён правёў першыя гады жыцця. Шлях пачынаўся ад Баброўнікаў і склаў 7 км. Паколькі надвор'е спрыяла — лёгкі марозік і сонца — усе ўдзельнікі прабегу атрымалі шмат задавальнення. Па дарозе да маршу далучыліся Ганна і Міхал — нашы сябры са Звязу беларускай моладзі.

У Мастаўлянах нас сустрэў добры знаёмы Уладзімір Канстанцінавіч Зарэцкі, які правёў да кутняга каменя сядзібы Каліноўскіх, па дарозе распавёўшы цікавыя дэталі з жыцця сям'і Каліноўскіх у гэтых мясцінах. Хвілінай маўчання прысутныя ўшанавалі памяць Кастуся Каліноўскага і ўсіх ваяроў, якія баранілі наш Край.

Развітаўшыся з Мастаўлянамі, рушылі мы ў бок Беластока. Выехалі на трасу Баброўнікі — Беласток і разгарнулі бел-чырвона-белы сцяг, што выклікала станоўчыя эмоцыі ў кіроўцаў, якія стаялі на мяжы.

Так прайшоў першы лыжны прабег у гонар Кастуся Каліноўскага. Спадзяемся, ён стане традыцыйным, і запрашаем усіх жадаючых на наступны прабег у будучым годзе.

Будзем ведаць, памятаць і ганарыцца сваёй гісторыяй!

Выказваем падзяку ўсім, хто нам дапамагаў у арганізацыі прабегу і асабіста сп. Яўгену Вапу, сп. Алегу Латышонку, Звязу беларускай моладзі і Радыё Рацыя.

Анатоль МІХНАВЕЦ

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку

запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

25 лютага 2010
доктар Ірына Багдановіч
„Беласточчына ў жыцці і творчасці Хведара Ільяшэвіча"
17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Стыпендыяты-артысты!

— Яшчэ не ведаю, на што прызначу сваю стыпендыю, — Лукаш Філіпюк з Бельска-Падляшскага не хавае ўзрушанасці. Можа пачне іграць у якім рок-гурце са старэйшымі музыкантамі!? Так, сучасная музыка яго захапляе. Як класіка, якую патрапіць спалучыць з рок-музыкай, металам, фолькам. Нягледзячы на свае маладыя гады, ён — лаўрэат многіх акардэонных фестываляў і конкурсаў у краіне. І як гэта бывае з сапраўднымі талентамі, патрапіць на хаду размаўляць па-беларуску. Праўда, ён вучань бельскай „тройкі" і яго асоба асвятлялася ў галерэі „Зоркі".

— Я пакуль яшчэ не быў на „Басовішчы", — кажа, — але мой старэйшы брат ездзіў. І яму спадабалася. Лукаш — у чацвёртым класе, і сам разумее, што каб папасці з сябрамі на рок-фестываль, трэба пачакаць. Пакуль паспяхова выступае на дабрачынных канцэртах. А захапленне, з якім успрымае ігру на акарэдэоне і музыку, аж заражае. Лукаш з музычнай сям'і, у якой амаль кожны іграе на нейкім інструменце. На ўрачыстую раздачу стыпендыі, якая адбылася 11 лютага ў Маршалкоўскай управе ў Беластоку, прыехаў з мамай. Таксама з бацькамі прыехаў Радаслаў Сахарчук з Маліннік. Радак — як адзіны з ліку сарака пяці стыпендыятаў — атрымаў стыпендыю ў галіне кінамантажу. Ягоныя здольнасці ў гэтай галіне заўважылі спецыялісты. Фільм пра арлянскіх яўрэяў „І асталася толькі сінагога", якую Радак рэалізаваў з сябрамі з Орлі, атрымаў галоўны прыз на прэстыжным фестывалі. Праўда, поспех папярэдзілі два гады майстар-класаў. На гала-ўрачыстасці ў Беластоку быў паказаны фільм „Памяці арлянскіх яўрэяў", у якім вуснамі арлянскіх старажылаў аўтары апавядалі пра шлюбныя абрады колішніх жыхароў Орлі. Амаль усе героі распавядаюць па-свойму, тэкст, дарэчы, перакладзены на польскую мову.

— Мы вельмі ўдзячны ўсім сябрам Радка, з якімі ён разам ствараў фільмы, — кажа Аліна Сахарчук, мама лаўрэата. Бацькі пад уражаннем поспеху сына. Хоць пра ўсё гаворыць стрымана:

— Цяжка сказаць як гэта будзе развівацца ў будучыні, — кажа спадарыня Аліна, — пакуль зацікаўленне фільмам мы ўспрымаем як хобі.

Радаслаў — вучань першага класа Бельскага белліцэя.

— Як успрынялі твой поспех сябры? — пытаем.

— Пазітыўна, — чую стрыманы адказ. Дарэчы, сам Радак не рабіў вакол сябе вялікага шуму. Але ў ліцэі належным чынам ацанілі яго поспех. Калі фільм пабачыў настаўнік інфарматыкі, пахваліў ён хлапца і паставіў яму пяцёрку па інфарматыцы.

— Ці адчуваеш складанасці з-за таго, што ты з беларускай вёскі? — пытаю.

— Не думаю пра гэта, — Радак свабодна размаўляе па-беларуску. — Я сам не адчуваю гэтых перашкод. За стыпендыю куплю тэлекамеру, новую праграму для мантажу і фотаапарат, каб узбагаціць кадры.

Сярод лаўрэатаў мы сустрэлі яшчэ Караля Лапінскага з Нарвы. Караль, як адзіны, атрымаў стыпендыю ў галіне мадэлізму. Хлапец заваяваў шмат узнагарод у рэгіёне і краіне. Свае хобі развівае пад кірункам настаўніка Яраслава Іванюка. У Беласток прыехаў з мамай і спадарыняй Алінай Кананюк — дырэктар гімназіі ў Нарве. Караль — першы лаўрэат мастацкай стыпендыі ў нарваўскай гімназіі.

— Мы спадзяемся, што яго прыклад быдзе матывіраваць іншых, — кажа спадарыня дырэктар.

Сапраўды, варта дабівацца мастацкіх стыпендый. На жаль, сярод лаўрэатаў я не сустрэла нашых таленавітых акцёраў, спевакоў і дэкламатараў. Варта пастарацца ў будучыні. Стыпендыя маршалка — 250 злотых у месяц — была прызначана 45 лаўрэатам з цэлага рэгіёна. Найбольш стыпендыятаў было ў галіне музыкі, пластыкі, тэатра, фатаграфіі...

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Лукаш Філіпюк (10 гадоў) — вучань Дзяржаўнай музычнай школы першай ступені ў Бельску-Падляшскім, займаецца ў класе акардэона. Захапленне і ангажаванасць, з якой вывучае інструмент, вылучае яго з ліку іншых. Нягледзячы на свае гады, Лукаш заваяваў ужо шмат бліскучых поспехаў. Ён — лаўрэат Макрарэгіянальнага акардэоннага конкурсу ў Алецку (2008), Агульнапольскага акарэдэоннага конкурсу ў Хэлме (2009), XI Грудзёндзкага акардэоннага конкурсу (2009), IX Фестывалю акардэоннай музыкі ў Ольштыне (2009). Як вучань бельскай „тройкі" прымае ўдзел у беларускіх дэкламатарскіх, тэатральных конкурсах. Захапляецца мастацтвам і прымае ўдзел у мастацкіх конкурсах. Выступае з дабрачыннымі канцэртамі на мерапрыемствах, напрыклад, ёлка для дзетак-інвалідаў ці жыхароў пансіянатаў для састарэлых.

Караль Лешак Лапінскі (13 гадоў) — вучань Публічнай гімназіі ў Нарве. Караль вылучаецца асаблівымі здольнасцямі ў мадэлізме. З вялікім поспехам клеіць мадэлі самалётаў, колавых ваенна-транспартных сродкаў і дыярамы. Ён — лаўрэат, між іншым, III месца XI Павятовага чэмпіянату школ па рэдукцыйным мадэлізме, дзе атрымаў узнагароду Саюза пілсудчыкаў РП. У 2008 г. — вылучэнне ў VIII Агульнапольскай мадэлісцкай бяседзе; вылучэнне ў XIV Павятовым чэмпіянаце школ па рэдукцыйным мадэлізме; лаўрэат I месца ў катэгорыі *бронетанкавая тэхніка*; II месца ў катэгорыі *самалёты*.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Радаслаў Сахарчук з бацькамі

Радаслаў Сахарчук (16 гадоў) — вучань хімічна-біялагічнага класа II Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучаня ў Бельску-Падляшскім. Радак праявіў здольнасці як мантажыст у час рэалізацыі фільма „І асталася толькі сінагога", за які атрымаў І месца ў катэгорыі мультымедыйных прац у Ваяводскіх элімінацыях XV Агульнапольскага краязнаўчага конкурсу „Poznajmy Ojczyznę". Прымаў удзел у праекце „Przywróćmy pamięć", дзе разам з сябрамі стварыў фільм, прысвечаны памяці арлянскіх яўрэяў. Фільм быў запрэзентаваны на І Аглядзе дакументальных фільмаў у Варшаве, а пасля ў Орлі, побач фільма Іаланты Дылеўскай „Полін", што было вельмі вялікім вылучэннем для Радка.

Супрасль

Нямнога на Падляшшы такіх цікава распаложаных мясцовасцей як Супрасль. З якога боку не дабіраліся б мы ў гэтае мястэчка, мусім пераехаць праз лес. Пасля прыбыцця ў Супрасль нашым вачам паказваецца праваслаўны манастыр — сімвал гэтае мясцовасці.

Супрасльскі манастыр паўстаў ужо ў пачатках XVI стагоддзя. Паводле легенды, праваслаўныя манахі ў пошуках найлепшага месца для ўсталявання манастыра пусцілі па рацэ крыж з надзеяй, што затрымаецца ён у месцы вызначаным Богам.

Заснавальнікам і галоўным фундатарам манастыра ў Супраслі быў Аляксандр Хадкевіч.

Ужо ў 1501 годзе ў Супраслі пабудавалі царкву св. Яна. Пасля вакол яе пачалі паўставаць манастырскія будынкі. Нейкі час пасля пачалася пабудова мураванай царквы Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы,якая мела выразна абарончыя рысы. Ужо ў 1516 годзе была яна высвячана. Таксама ў гэты перыяд манастыру была падаравана копія Смаленсай Іконы Божай Маці, якая пазней праславілася як цудатворная Супрасльская Ікона Божай Маці.

У XVII стагоддзі, калі супрасльскі манастыр быў перахоплены ўніятамі, пачалося развіццё яго выдавецкай дзейнасці, стаў ён таксама буйным культурна-асветніцкім цэнтрам.

У 1824 годзе манастыр у Супраслі вярнуўся ў праваслаўе.

XX стагоддзе прынесла манастыру Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы многа няшчасцяў. У міжваенны перыяд быў ён адабраны праваслаўным, але найбольш трагічная падзея прыйшла ў 1944 годзе, калі адступаючыя нямецкія войскі ўзарвалі Дабравешчанскую царкву.

Ад некалькіх дзесяткаў гадоў супрасльскі манастыр вяртаецца да свайго даўняга характару. У 1980-х гадах пачалася адбудова знішчанай немцамі царквы, у Супрасль вярнуліся манахі.

Зараз супрасльскі манастыр гэта адно з важнейшых месц праваслаўнага культу на Беласточчыне. Варта тут таксама прыехаць, каб паглядзець музей ікон, манастырскую забудову, царкву, або пашпацыраваць па Кнышынскай пушчы.

Міхась СЦЕПАНЮК

Музыка з кайфам

Рэха Немэна: Пётр Ялфімаў

Гэты прыгожа апрануты ў белы касцюм хлапец на здымку з'яўляецца высакародным беларускім талентам. Гэта не толькі мой погляд, але ў асноўным большасці людзей, якія сутыкнуліся з яго выкананнямі. Пётр Ялфімаў — выдатнік, які атрымаў адукацыю ў галіне опернага спеву, аднак вырашыў выступаць у асноўным на эстрадах.

— Пётрэк, Пётрэк, біс, біс! — крычалі слухачы ў Беластоку, калі Пётр Ялфімаў праспяваў песні Чэслава Немэна.

Не была гэта эстрада, толькі скромная аўдыторыя бібліятэкі Універсітэта ў Беластоку. У падляшскую сталіцу Ялфімаў прыехаў разам з універсітэцкім джаз-бандам „Капрыз" з Гродна, з якім супольна выконвалі праграму, прысвечаную памяці Чэслава Немэна.

І пра каго вам тут распавесці ў першую чаргу? Пра Ялфімава ці Немэна? А можа пра згаданы „Капрыз"? Аднак пачнем з Ялфімава, бо хаця вечарына ў Беластоку была прысвечана Немэну, то якраз ён стаў яго маленькай зоркаю.

З творчасцю Немэна Ялфімаў пазнаёміўся ў 2004 годзе, калі песняй „Дзіўны гэты свет" заваяваў Гран-пры фестывалю „Славянскі базар" у Віцебску. З таго часу стаў ён папулярызатарам Немэна ў Беларусі, а калі спявае, слухачам здаецца, што на момант ажывае немэнаўскі дух. Аднак сам Ялфімаў як выканаўца мае многа твараў. Можа гэта здавацца дзіўным, але як оперны спявак вельмі добра ўпісваецца ў рамкі музыкі мэтал. Таму спявае між іншым і ў гэві-мэталёвым гурце, а як прадзюсар апякуецца таксама іншымі гуртамі гэтай творчай галіны. Неяк цягне яго да моцных гукаў, таму ў мінулым годзе не адмовіўся ад удзелу ў рок-фестывалі „Bela Music", што прайшоў у траўні пад Мінскам. Таксама і з-за моцнага рок-выканання, паводле некаторых аглядальнікаў, не трапіў у мінулым годзе ў фінал „Еўрабачання". Сам сцвярджае:

— На прэс-канферэнцыі перад конкурсам я сказаў, што ў мяне лепшая песня, але пераможа Аляксандр Рыбак.

Зараз ужо ідуць адборы да чарговага конкурсу, у якім Пётр не бачыць шансаў для беларусаў. Свой вопыт „Еўрабачання" ён пакідае за сабою і займаецца перш за ўсё аўтарскай творчасцю, таму ўжо вясной з'явіцца ў продажы яго новы альбом.

i_basovka@o2.pl

Фота Ілоны КАРПЮК



Польска-беларуская крыжаванка № 8

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 4:

Гурба, гул, лес, ікс, шалік, паляк, пульс, ар, валізка, конь, Ян, тамат. Гліна, вол, рыс, пан, пульт, шалі, бальзам, ласка, улік, лек, грунт.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Паўліна Паплаўская** з Бельска-Падляшскага і **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!

У снежным антуражы

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Аўтобусны прыпынак у Юшкавым Грудзе распаложаны не толькі пры расхадных дарогах у Новую Волю, Шымкі і Бандары, але і ў грамадскім цэнтры важнай некалі вёскі. З таго цэнтра захавалася, па сутнасці, адно царква. Юшкаўскому прыходу зараз сто адзін год, а царква на тры гады малодшая. Насупраць царквы былая геэсаўская крама, цяпер прыватная. Крыху далей пусты будынак былой школы, а паміж школай і крамай бязлюдны будынак з такім жа вонкавым выглядам, што і былая школа, а гэта дазваляе здагадвацца, што і ў ім была нейкая грамадская ўстанова. Пытаю мужчыну, што нечага чакае на аўтобусным прыпынку, што было ў тым будынку, паміж школай і крамай.

— А яго купіў Баршчэўскі з Бандароў.

Ну то я цяпер з іншага боку вяду разведку:

— А дзе тут была калісь гміна?

— Ну, вось у гэтым будынку.

Удалося! Але яшчэ цікую, чаго чакае той чалавек, які прывёў на прыпынак ровар, па заснежаных дарогах. Бо ж, на мой погляд, адзіны аўтобус, на якім можна было паехаць некуды ў свет, гэта той, на якім прыехаў я, і які вернецца з Ялоўкі недзе праз гадзіну. Мужчына інфармуе мяне, што менавіта ён таго аўтобуса і чакае, а паедзе ён у напрамку Міхалова праз сорак пяць мінут; пакуль што збіраецца зайсці ў краму пагрэцца. Але пакуль ён думаў як зайсці ў краму, я ўжо тую краму наведаў і адправіўся па сваіх каардынатах; у згаданай краме аднюсенькая прадаўшчыца чакала пакупнікоў...

Пункт прыёму малака засыпаны снегам. Зараз за ім будынак вясковай амбулаторыі, да якога пратаптаныя шмат слядоў. Але дзверы закрытыя. Няма ніякай інфармацыі, калі тая лячэбная ўстанова працуе; сама шыльда на ёй і згаданыя сляды быццам паказваюць, што нейкае лекаванне там адбываецца. Пра дэталі няма каго распытаць. Перад уваходам у амбулаторыю ляжыць часткова яшчэ зялёны фікус...

Мінаю панадворак з шыльдай гайнаўскай малачарні і выходжу на чарговыя расхадныя дарогі. Паказальнік інфармуе, што адна з іх у Кухмы, а другая ў Ціванюкі. Напраўляюся ў Кухмы і зараз перада мной забудова з белай шыльдай вёскі Ціванюкі. У шырокім свеце ўсе дарогі ў Рым вядуць, а з поўначы Юшкавага Груда — у Ціванюкі...

Зімовая дарога, што спалучае ціхія, малалюдныя вёскі, расчышчана ад снегавой коўдры; на ёй насціл адно з пласта спрасаванага снегу, не абледзянелага, не раструшчанага пад цяжарам нагружаных машын. Па такой дарозе лёгка хадзіць, выгадна ездзіць. Паабапал дарогі з Юшкавага Груда ў Кухмы, якія складаюцца з некалькіх прысёлкаў, крыху відаць цяперашняе палявое гаспадаранне. Пішу „крыху", бо ж поле заслана тоўстым белым пухам, праз які на многіх участках прабіваюцца вяршкі сасновых пасадак. Пасадкі тыя маладыя, узніклі яны ўжо ў еўрасаюзную эпоху. Нават прыманка сельскагаспадарчых даплат не заахвоціла мясцовага вясковага народу абрабляць раллю...

Царква ў Юшкавым Грудзе

У Кухмах выходжу на іншую дарогу, у напрамку Падазяран. Дарога тая больш насычаная рухам машын, таму і больш разбіты яе снегавы насціл, ёсць у ім шмат калдобін, па якіх і пешаходу нявыгадна хадзіць. Затое дарога тая пралягае праз лес, які ў зімовы час становіцца свайго роду творам захапляючага мастацтва аўтарства гэтай неспрыяльнай пары года. Краявід прымае выгляд адмысловай графікі, размаляванай белым, карычневым і зеленаватым колерамі зімовага лесу. Тут і буйныя снегавыя дадаткі прыдаюць лесу красы, быццам іншым прыгажуням тыпсы, тушы ці сіліконавыя імпланты...

Побач дарогі ўвагу прыцягвае здаровая сасна, абгароджаная сінім плотам, з высока прычэпленымі на стволе абразамі Езуса і Марыі ды простым драўляным крыжам пасярэдзіне. Крыху далей, у бок Падазяран, высіцца просты лацінскі крыж.

У Падазяранах на адным з панадворкаў пажылы мужчына адгортвае снег. Заводжу з ім гутарку, намагаючыся даведацца нечага пра згаданую прыдарожную святыню. Але чалавек прыкідваецца, што нічога пра яе яму невядома.

Адмысловая лясная капліца каля Падазяран

Пасярэдзіне вёскі хата з салтысоўскай шыльдай, дык заходжу туды з надзеяй даведацца пра інтрыгуючы мяне арыгінальны лясны культавы аб'ект. У хаце пажылыя жанчына і мужчына ды маладая жанчына, якая зараз пераходзіць у суседні пакой. А мужчына мне і расказаў пра лясную святыню.

Надрэўная капліца знаходзіцца там больш ста гадоў. Калісь буйное дрэва ў лесе купіў адзін чалавек і прызначыў яго на культавы аб'ект; былі на ім устаноўлены фігуркі. Аднак у час г.зв. камуны адзін лясны чыноўнік заўпарціўся ліквідаваць гэты рэлігійны аб'ект, нягледзячы на тое, што ён быў прыватнай уласнасцю. Загадаў ён лясным работнікам ссекчы дрэва, на якім былі рэлігійныя сімвалы. Але работнікі адмовіліся гэта зрабіць. Тады ён сам прыехаў ноччу і зрэзаў дрэва; фігуркі, што былі на ім, паразбіваліся. Аднак мясцовыя людзі абралі недалёка іншае дрэва, якое зноў прызначылі культавым мэтам. Адно на ім ужо не памясцілі фігур, толькі абразы. Недалёкаму крыжу таксама за сто гадоў, яго ўжо бадай тройчы перакопвалі, адкідаючы згніўшую падставу.

У краме, якая таксама пасярэдзіне вёскі, апрача маладой прадаўшчыцы, чацвёра мужчын абмяркоўваюць найважнейшыя справы. Бо ж у зімовы, вальнейшы ад працы, час мужчыны патрабуюць пагутарыць; у Англіі „моцны пол" збіраецца ў пабах, а ў нашых вёсках такіх устаноў яшчэ няма, але крамы дзенідзе асталіся.

За вёскай будынак былой школы. Агледзеўшы яго, вяртаюся да дарогі, што ў Вейкі. Аднак з недалёкай хаты выходзіць пажылы мужчына і цікавіцца маёй асобай; заводзім гутарку. Субяседнік інфармуе мяне, што разам з жонкай сачыў ён за мной. І выйшаў пацікавіцца, ці я не з Галандыі, бо раней бывалі тут і разглядаліся галандцы. Ён з імі заводзіў знаёмствы, а гэта было нацяжка рабіць, бо ў вайну быў ён на прымусовых работах у Германіі, і добра засвоіў нямецкую мову, якая і галандцам не чужая.

І стаў мне чалавек расказваць пра свае ваенныя прыгоды. Яшчэ да прыходу саветаў атрымаў ён у час перастрэлкі раненне, асколкі ад якога ён носіць і па сённяшні дзень; нават загадаў ён мне памацаць тыя асколкі. Саветы, нягледзячы на раненні, забралі яго ў свой шынель, не зважаючы на ягоныя просьбы адпусціць яго ў касцюшкаўскае войска. Праз Каўнас, Мінск, Смаленск, Волгу, Іркуцк трапіў ён на мангольскую граніцу, а пасля прайшоў усю Маньчжурыю — праз Харбін, Мукдэн — у Порт-Артур. Чатыры гады не бачыў ён *ni ojca, ni matki, ni rodzonej chatki.* А калі вярнуўся ў родную вёску, пабудаваў сваю хатку, і трывалыя гаспадарчыя будынкі.

Паінфармаваў ён мяне таксама, што школа ў Падазяранах была пабудавана пры санацыі, а цяпер у ёй жывуць „бяздомныя", якіх скіравала сюды гміна. У суседнім будынку, якога вокны забіты дошкамі, жылі раней настаўнікі. На акраіне школьнага пляца магіла савецкіх салдат, якія ўзарваліся на міне ў Вейках; разам з імі спачывае і невядомы польскі салдат, забіты нямецкімі разведчыкамі ў 1939 годзе. На развітанне сімпатычны суразмоўца сказаў мне: *Zdrowia, szczęścia i słodyczy pan Sołowiej życzy.*

У маёй вёсцы хадзіла калісь пагаворка: Шымкі, Вейкі — вёскі вельмі, Юшкаў Груд — і ўжо тут! Цяпер пра Вейкі, як пра вялікую вёску, гаварыць не прыходзіцца. Апусцела яна вельмі. Вось, уваходзячы ад Падазяран, вітае наведвальніка пустуючы пункт прыёму малака ды распачаты будынак, здаецца, аўтарамонтнай майстэрні. Крыху далей пусты здаўна будынак вясковай геэсаўскай крамы, перад якой зараз конная грабілка — такі, можна сказаць, скансэн-музей. Яшчэ далей будынак былой школы з заплюшчанымі вокнамі. За ім будынак з шыльдай прыватнай крамы, уваход да якой накрыты некранутым тоўстым снежным покрывам. Чарговы будынак, з расчышчанымі праёмамі, здаецца быць былой вясковай святліцай.

І зноў лес, які пачынаецца яшчэ ў межах Вейкаў, і даходзіць аж да Бялевіч. Меркаваў я нацэліцца і ў Меляшкі, аднак з боку Вейкаў лясная дарога ў бок Меляшкоў не была расчышчана ад снегу.

Асобнае слова належыцца аўтамабільным карыстальнікам гэтых лясных дарог. Вялікім і вельмі прыемным сюрпрызам была для мяне іхняя ветлівасць. Па дарозе з Кухмоў у Падазяраны каля паловы з іх спыняліся каля мяне прапануючы падвезці. А з Вейкаў у бок Гарадка — амаль усе. Вялікае ім дзякуй!

Калі невядома ў чым справа, то — як кажуць — справа ў грашах. Калісь, не толькі невялікім ручаём, а можна сказаць што і рэчкай плылі яны ў БГКТ. Але, ўжо ад двух дзесяткаў гадоў, калі рэчка разлілася на ручайкі па ўсіх беларускіх арганізацыях і мерапрыемствах, падняўся вялікі крык, што дэмакратыя нішчыць культуру і то не толькі беларускую.

Смутныя рэфлексіі з нагоды XVI з'езда БГКТ

Міхась КУПТЭЛЬ

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Валянціна Ласкевіч і Янка Сычэўскі ў час апошняга з'езда

Можна махнуць рукой на тое, чым цяпер з'яўляецца БГКТ з новавыбраным старшынём Янкам Сычэўскім, прачытаўшы „З'езд-оперу" Аляксандра Вярбіцкага ў „Ніве". Бо чым жа цяпер з'яўляецца Беларускае грамадска-культурнае таварыства? Па-мойму гэта рэлікт мінуўшчыны, культурна-грамадскі скансэн. У рэальным жыцці патрэбны і скансэн, каб можна было параўнаць сучаснае з мінулым, калі заглянеш у вандроўцы ў мінулае. А калі БГКТ з'яўляецца свайго роду скансэнам, то вядома, што ён нерэфармавальны. Затым няма чаго тут абурацца на мову шматгадовага старшыні Таварыства, бо такая думка мільганула ў мяне хвіліну потым, як я зазнаёміўся з артыкулам А. Вярбіцкага. Маю нават творчы падыход да справы, калі Таварыства будзе існаваць у такой форме. Прапаную ўпісаць БГКТ у турыстычныя даведнікі ў якасці атракцыёна Беластока. Ехалі б турысты ў Белавежскую пушчу, каб пабачыць апошні цуд прыроды ў Еўропе, а па дарозе заязджалі б на вуліцу Варшаўскую, дзе маглі б пазнаёміцца са слаўным мінулым польскіх беларусаў, згуртаваных у Таварыстве.

Як жа інакш можна ўспрымаць справаздачу старшыні БГКТ з чатырохгадовай дзейнасці на XVI з'ездзе як не рэха мінуўшчыны. Чытаю, што тады „Ніва" была іншай газетай, тады „Ніва" служыла беларусам. Затым пытаю: не сорамна вам, журналістам, супрацоўнікам рэдакцыі, карэспандэнтам, што служыце цяпер усім, толькі не беларусам? Гляньце, што вырабляюць з нашым асяроддзем „малайцы" і іншыя правакатары ды прадажнікі нацыянальных інтэрэсаў, калі арганізуюць палітычную правакацыю, каб знішчыць эманацыю беларускай культуры — **БГКТ**. Не будзьма смешнымі. Ці ж можна ўявіць сабе, што такія беларускія „патрыёты" як старшыні Беларускага саюза, Беларускага гістарычнага таварыства ці БАС ствараюць нейкую беларускую культуру?

Што з таго, што Беларускае гістарычнае таварыства арганізуе гістарычныя навуковыя канферэнцыі і выдае „Беларускі гістарычны зборнік". Ці ж гэта праява беларускай культуры? А „Ніва" з „Зоркай", якія штотыдзень дзесяткамі гадоў трапляюць у рукі чытачам — малышам і пажылым? Ці „Часопіс" — польска-беларускі штомесячнік? Рэдакцыі беларускіх радыё- і тэлеперадач і іх прысутнасць у эфіры, ці іншыя мерапрыемствы, напрыклад, „Бязмежжа" або „Трыялогі"? Гэта таксама праява беларускай культуры? Як можа так думаць праўдзівы бэгэкатовец?

Не то, што беларускія фэсты ці аматарскі рух па вёсках і гарадах усходняй Беласточчыны. Там існуюць праўдзівыя калектывы. „Насуперак усім перашкодам, цяжкасцям і **знішчаючым сілам** (выл. — М. К.) актыўнасць ГП у згаданыя гады не знікла". І далей: „Непрадбачаныя цяжкасці і перашкоды мабілізуюць нас і ўвесь аматарскі рух да стойкасці і асаблівай актыўнасці, каб не дазволіць на знішчэнне вопыту і дасягненняў некалькіх пакаленняў беларускіх патрыётаў". Вядома прытым хто тут патрыёт, а хто знішчальнік, хто вораг, а хто сябра. Дзяржава, замест фінансаваць беларускамоўныя СМІ, павінна ведаць, што адзінай сапраўднай арганізацыяй, якая дбае пра беларускую культуру, каб тая не загінула, з'яўляецца БГКТ пад кіраўніцтвам Валі і Яна.

Як вынікае з вышэйшай высновы, нам, грамадзянам РП, а мабыць і Еўропы, патрэбны такі скансэн. Толькі дзякуючы кантрасту можна ведаць чым розніцца сучаснасць ад мінулага.

* * *

З вялікай увагай зазнаёміўся я з допісамі Віктара Буры („Мае ўражанні ад З'езду" — „Ніва" № 03/2010 і „Аб з'ездаўскіх прапановах" — „Ніва" № 04/2010) і Васіля Сакоўскага („Нязгода руйнуе" — „Ніва" № 04/2010).

Віктар Бура піша: „З пункту гледжання Я. Сычэўскага ўсе наваліліся на яго, душаць знішчаюць і што там яшчэ..." — у тым то і справа, што гэта адзіны пункт гледжання. Выглядае на тое, што з яго „пункту гледжання" ніхто не займаецца нічым іншым, як толькі знішчэннем Яна. Нягледзячы на ўсё не так ужо і кепская форма старшыні Таварыства, калі заўсёды можа разлічваць на прыхільнасць Міністэрства культуры РБ ці хоць бы Гродзенскага аблвыканкама („З'езд-опера" — „Ніва" № 01/2010).

Затое Васіль Сакоўскі, як добры і разумны бацька, заклікае пасварыўшыхся дзяцей да згоды. Пытае хто вінаваты і адказвае, што „вінаватыя ўсе мы — проста не ўмеем і не хочам дагаварыцца ціха, спакойна між сабой, пайсці на ўзаемныя ўступкі". Спадар Васіль, не такія мы ўжо дзеці, што нешта разумеем, і то яшчэ калі ўважна зазнаёмімся з артыкулам А. Вярбіцкага „З'езд-опера".

Калі невядома ў чым справа, то — як кажуць — справа ў грашах. Калісь, не толькі невялікім ручаём, а можна сказаць што і рэчкай плылі яны ў БГКТ. Але, ўжо ад двух дзесяткаў гадоў, калі рэчка разлілася на ручайкі па ўсіх беларускіх арганізацыях і мерапрыемствах, падняўся вялікі крык, што дэмакратыя нішчыць культуру і то не толькі беларускую.

Каб атрымаць грошы, трэба пісаць нейкія праекты, трэба разлічвацца да апошняга граша, і то яшчэ бюракратычна, нейкімі фактурамі! Нейкім установам пісаць справаздачы, і то тэрмінова. А калі не ўмееш усяго гэтага, то найлепш зваліць на палітычную дзейнасць дзяржавы і знішчальныя сілы.

Усе мы ведаем, што Я. Сычэўскі быў некалі паслом і палітыкам СЛД і не перастаў ім быць цяпер. Уключыў Таварыства ў палітыку. Найлепш да гэтага надаецца лозунг, што існуючая правая ўлада прыгнятае беларускую культуру. А з кім, як не разам з СЛД, ваяваць за яе існаванне. Аказваецца, што фэсты найлепш надаваліся для таго, каб выбаршчыкам паказацца абаронцам нацыянальнай культуры. Можа хтось калісь падсумуе і пакажа, што для беларускай меншасці ў Польшчы зрабіла так званая левая ўлада, прадстаўніком якой быў калісь старшыня БГКТ, а цяпер Яўген Чыквін.

* * *

На пачатку 1990-х гадоў мінулага стагоддзя з'явілася грамадскасці магчымасць арганізавацца незалежна ад улады. Беларуская меншасць таксама пакарысталася такой магчымасцю. Манаполія БГКТ на грамадска-культурную дзейнасць назаўсёды перастала, дзякуючы актыўнасці свядомых беларусаў, функцыянаваць. Мінула ўжо дваццаць гадоў дэмакратычных перамен, досыць вялікі перыяд часу, каб нешта зразумець з існуючыяй рэчаіснасці, але не для беларусаў, згуртаваных у БГКТ. Факт, што арганізацыйнае асяродзе беларусаў у Польшчы, як прыкмеціў генконсул РБ Міхал Аляксейчык, выглядае на растапыраныя пальцы. Не сказаў ці адной рукі, якая трымае гэтыя пальцы, і ў кожнай хвіліне можа зацісну ць у кулак.

З аднае стараны добра, што існуюць розныя арганізацыі, суполкі і мерапрыемствы, яны ж дзейнічаюць з карысцю для згуртаваных у ёй членаў, бо не хто іншы, як толькі беларусы з'яўляюцца іх членамі, і агулам у карысць беларускай грамадскасці яны дзейнічаюць. З другой стараны горш, што няма ідэйнай еднасці. Можа калісь, калі ветэранаў, якія замест уступіць месца і перадаць свой вопыт малодшым, не скажоным яшчэ руцінай і навыкамі такімі, што ўлада сама па сабе будзе фінансаваць культурную дзейнасць беларусаў, хтосьці ідэйную еднасць сфармулюе і давядзе да свядомасці грамадства. Працэс гэты доўгі.

Пакуль што, калі гэта працэс, а сам па сабе ён не зрэалізуецца, то трэба думаць прынамсі пра спатканне за круглым сталом на пачатак. Не думаю, што калі б старшыня Я. Сычэўскі атрымаў прапанову сустрэчы з боку старшыні Беларускага саюза Я. Вапы, то яе адкінуў бы. Як намовіць і пераканаць да спаткання шэфаў іншых арганізацый апарата БГКТ? Гэта добрае пытанне, якое паставіў В. Сакоўскі.

Каб дайшло да сустрэчы, трэба адарвацца ад думкі, што гэтыя суполкі, таварыствы, арганізацыі саставляюць сабе канкурэнцыю да крыніцы свайго існавання ў грамадскай прасторы — дзяржаўных датацый. У іншым выпадку нават няма чаго і думаць, што ўдасца вызначыць супольную мэту.

Можа наіўна думаю, але немажліва, каб хтось быў супраць навучання беларускай мовы ў школах. Добра што існуюць калектывы па вёсках і мястэчках, і самаўрады разам з БГКТ або самастойна арганізуюць фэсты і фестывалі для людзей. Добра што існуюць „Ніва", „Зорка", Часопіс". Добра што існуе радыё „Рацыя" і можна глядзець у тэлебачанні беларусаў. Ці хтось выступае супраць „Трыялогаў", „Бязмежжа" або „Хаткі" на ўзбярэжы мора ці згуртаванню „Белавежа"? Пэўна няма такіх сярод беларусаў. А калі так, то чаму нельга дагаварыцца між сабой, каб усё функцыянавала без сварак і канфліктаў? Не функцыянуе, бо перашкодай з'яўляецца амбіцыя таго ці іншага дзеяча, ці мо што іншае?

Да 100-годдзя Ларысы Геніюш

Сёлета 9 лютага ў Мінску ў Літаратурным музеі імя Максіма Багдановіча планавалася вечарына, прысвечаная беларускай паэтцы Ларысе Геніюш, 100-гадовы юбілей якой наша грамадскасць плануе адзначыць у жніўні. Але раптам вечарыну адклалі. Як сказала журналістам дырэктар музея Таццяна Шаляговіч, вечарына не адмяняецца, а пераносіцца на пэўны час, бо час жа ёсць да жніўня месяца.

Сапраўды, час ёсць, але ж вечарына была ўжо арганізавана, запрошаны на яе вядомыя людзі Беларусі. І раптам, вечарыну перанеслі, ці проста забаранілі. Праўда, гэта не спалохала творчую дэмакратычную інтэлігенцыю Беларусі. Літаральна на другі дзень у Мінску, на сядзібе ТБМ, адбылося пасяджэнне аргкамітэта па ўшанаванню юбілею нашай вялікай беларускай паэткі Ларысы Геніюш. Пасяджэнне адкрыў паэт і журналіст Міхась Скобла, які прапанаваў абмеркаваць план юбілейных мерапрыемстваў на ўвесь 2010 год. Найперш мяркуецца звярнуцца да прэм'ер-міністра Чэхіі аб вяртанні чэшскага грамадзянства Ларысе Геніюш, якое яна мела ў 1947-1948 гадах, а таксама з падобнай заявай звярнуцца да беларускіх улад аб яе поўнай рэабілітацыі. Як сказаў пісьменнік і гісторык Міхась Чарняўскі, Ларыса Геніюш са сталінскіх лагераў была проста вызвалена без рэабілітацыі. Сёлета таксама мяркуецца адкрыць мемарыяльную шыльду ў Празе на доме, дзе жыла паэтка па вуліцы Гежманова, 7.

2010 год у Беларусі аб'яўлены годам Ларысы Геніюш. Да гэтай даты (100-годдзе будзе адзначацца 9 жніўня) плануецца наладзіць Другі фестываль беларускай хрысціянскай паэзіі ў Сынковіцкай царкве Зэльвенскага раёна.

Вялікае літаратурнае свята мяркуецца правесці ў Зэльве, дзе жылі Ларыса і Янка Геніюшы, дзе яны пахаваны на мясцовых могілках, дзе стаіць хата, у якой яны жылі.

Акрамя гэтага, літаратурныя імпрэзы адбудуцца ў іншых гарадах і мястэчках Беларусі, а таксама, і на гэта мы спадзяемся, вечар „Ад родных ніў" пройдзе ў мінскім Літаратурным музеі імя Максіма Багдановіча, які будзе наладжаны Саюзам беларускіх пісьменнікаў сумесна з Чэшскай амбасадай у Беларусі.

Плануюцца цікавы бардаўскі канцэрт „Запяі мне песню", прысвечаны Ларысе Геніюш, выстава дакументаў з архіва паэткі ў бібліятэцы Нацыянальнай Акадэміі навук, навукова-літаратуразнаўчая канферэнцыя па творчасці Ларысы Геніюш у Мінску ў Рэспубліканскім архіве-музеі літаратуры і мастацтва ды іншыя.

Да 100-годдзя нашай слыннай паэткі мяркуецца выданне выбраных твораў паэткі ў серыі „Гарадзенская бібліятэка", памятнага медаля „100 гадоў Ларысе Геніюш", паштоўкі і канверта, дакументальнага фільма пра гэтую выдатную асобу на „Белсаце", інтэрнэт-старонкі на „Камунікаце", выпуск штотыднёвых перадач на радыё „Рацыя", выданне тэматычнага бібліяграфічнага альманаха „Асоба і час", цалкам прысвечанага Л. Геніюш, а таксама кнігі ўспамінаў пра яе.

Ужо сёння наладжваюцца і адбываюцца прысвечаныя паэтцы літаратурна-музычныя сустрэчы ў рэгіёнах Беларусі ў межах кампаніі „Будзьма беларусамі".

Да 100-годдзя Ларысы Геніюш мяркуецца добраўпарадкаванне радзіннага кутка паэткі ў Жлобаўцах каля вёскі Палаўкі Ваўкавыскага раёна, збор подпісаў у Зэльве за перайменаванне Савецкай вуліцы, дзе жыла паэтка, у вуліцу Ларысы Геніюш і дзесяткі іншых мерапрыемстваў.

Сяргей ЧЫГРЫН

Беларускія краявіды, людзі, іх позіркі і ўсмешкі, перажыванні і захапленні — як не дзіўна, гэта тое, што можа прыцягнуць і прыцягвае ўвагу іншаземцаў. Значыць, ёсць у Беларусі і ва ўсім, што з ёю звязана, нешта непаўторнае, прывабнае і захапляльнае. Магчыма, што мясцовы люд не ў вялікім захапленні ад акаляючай яго рэчаіснасці, але гледзячы на замежныя мастацкія фотатворы, прысвечаныя беларускай зямлі, верагодна паглядзіць на яе крыху па-іншаму. Зрабіць такую карэкціроўку поглядаў дапаможа сайт „Радзіма Фота", што месціцца па адрасе http://radzimaphoto.com.

Тое, што сайт неардынарны, бачна не толькі з яго будовы, але і з аўтара — амерыканца Джона Кунстадтэра, які працаваў у Беларусі ў якасці намесніка амбасадара ў 2000-2001 гадах. Пэўна, нават невялікі тэрмін працы у гэтай краіне пакінуў у душы былога дыпламата незабыўныя ўражанні, якія ён прагне перадаць праз уласнаручна зробленыя фотаздымкі.

«Маё фатаграфічнае падарожжа па Беларусі няспынна натхняе мяне і вядзе па трох сьцежках, — распавядае Кунстадтэр на старонцы „Пра сайт". — Першая — стварэньне беларускага брэвіярыя. Гэта спроба адлюстраваць кола года, а таксама новае нараджэньне веры, што адбываюцца пры адметным беларускім асьвятленьні, напаўняюцца адметным беларускім водарам глебы і адметным беларускім пачуцьцём повязі з радзімай. Другая сьцежка — гэта спроба адлюстраваць глыбокую, нязломную і — зноў жа — адметную і неад'емную эўрапейскасьць беларускай культуры, беларускай сутнасьці. Незьлічоную колькасьць разоў я быў сьведкам таго, што сэрца беларускай нацыі б'ецца ў кожным малым, нават у немаўляці, што мова нацыі сьпявае ў кожным жэсьце і кожнай усьмешцы, што беларусы сьціпла і непахісна спраўджваюць словы вялікага беларускага паэта Максіма Багдановіча: „Так рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак"».

Трэцяя сцежка дыпламата-фотааматара вядзе яго, як ён кажа, да разумення сувязі амерыканскай і беларускай нацый. У якасці аднаго з такіх прыкладаў ён называе Тадэвуша Касцюшку, бо „ён ёсьць сынам і беларускай глебы". Таму, падсумоўвае Кунстадтэр, „калі мы глядзім на партрэты, змешчаныя на гэтым сайце, мы ў значнай ступені глядзім на саміх сябе".

Практычна ўсе фотаздымкі чорна-белыя. Магчыма, гэта адна з асаблівасцей успрыняцця фатографам беларускай рэчаіснасці, а магчыма, ён бачыць больш трапным менавіта такі фотарасповед.

Сайт змяшчае некалькі тэматычных рубрык. Першая — „Над Беларусяй ціхай і ветлай", дзе месцяцца здымкі сялян, вёсак і пейзажаў.

„Кола года" прысвечана рэлігійным і народным абрадам, якія па чарзе на працягу цэлага года маюць месца ў беларускім жыцці. Тут знаходзяцца фотаздымкі святкаванняў Божага Нараджэння, дажынак, Купалля, спынены імгненні прычашчэння дзіцяці, пахаванняў, працы аратага за плугам.

Праваслаўная царква і каталіцкі касцёл, якія не адно стагоддзе суіснуюць на беларускіх землях, прадстаўленыя і на здымках Кунстадтэра. Большасць ягоных прац на рэлігійную тэму знаходзяцца на старонцы „Новае нараджэньне веры".

Акрамя тэматычнага дзялення, фотаздымкі аўтара згрупаваны ў архіве па месяцах, кожнаму з якіх прысвечана асобная рубрыка.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Надвор'е раздае медалі

Першая біятлонная гонка алімпіяды ў Ванкуверы прынесла ў значнай ступені сенсацыйныя вынікі. Прычынай гэтаму і ўмовы надвор'я, і спецыфіка менавіта алімпійскіх стартаў, калі ўвесь ранейшы сезонны расклад часта мяняецца да непрадказальнасці. У жаночым спрынце на сем з паловай кіламетра з фаварытаў толькі Магдалена Нойнэр з Нямеччыны здолела пацвердзіць свае прэтэнзіі. Але і тут не абышлося без нечаканасці. Маючы перад сабой вынік галоўнай прэтэндэнткі на золата, Нойнэр не здолела „дапрацаваць нагамі" (калі такое было!) і ў выніку адстала ўсяго на 1,5 секунды, задаволіўшыся серабром. Чэмпіёнкай жа неспадзявана стала прадстаўніца Славаччыны Анастасія Кузьміна. Яна фінішавала ў першай групе, але ніхто так і не здолеў палепшыць яе вынік. У значнай ступені з-за таго, што падчас гонкі пайшоў дождж, што „замарудзіла" снег і тыя, хто стартаваў пазней, апынуліся ў горшых варунках. Бронзавую ўзнагароду заваявала прадстаўніца Францыі Мары Дарэн — трэба было бачыць радасць юнай і малавядомай шырокаму колу біятланісткі! Усяго ж стартавалі 89 удзельніц. Беларускія прадстаўніцы зрабілі ўсё, што маглі. Яны паказалі лепшую ў сезоне сваю стральбу. Дастаткова сказаць, што Дар'я Домрачава, Людміла Калінчык і Надзея Скардзіна разбілі ўсе талерачкі і прайшліся па дыстанцыі па нулях (ізноў жа — калі такое было!). А Вольга Назарава на першым рубяжы была бездакорнай, а вось стральбу стоячы заваліла — ажно тры незакрытыя мішэні. У выніку яна 74-я ў пратаколе, Скардзіна — 28-я, Калінчык — 17-я. Ну а Домрачава трапіла на так званую кветкавую цырымонію, заняўшы 8-е месца і прынёсшы першае ачко ў залік зборнай Беларусі. Вынікі паказваюць, што аб'ектыўна нават пры абсалютна дакладнай стральбе ходам беларускі ідуць слаба. Тым не менш у наступнай гонцы пераследу Домрачава мае рэальныя шанцы на медаль. Яна будзе стартаваць праз 20 секунд пасля „п'едэстальнай" Дарэн.

Снег зблытаў усе карты фаварытам у мужчынскім спрынце. У выніку тыя, хто стартавалі ў першай частцы, калі неба было яшчэ чыстым, атрымалі лепшыя шанцы. Залатую рыбку ў мутнай вадзе сенсацыйна вылавіў Венсан Жэ з Францыі, які адстраляў абсалютна дакладна. З лідараў вызначыўся толькі нарвежац Эміль-Хэгле Свендсан, у якога сярэбраная ўзнагарода. Зноў, як і на чэмпіянаце свету, здзівіў харват Якаў Фак — у яго бронзавы медаль. З беларусаў прыемна ўразіў Аляксандр Сыман — ён ці не ўпершыню за апошнія гады адстраляўся па нулях і заняў высокае 20-е месца. У Сяргея Новікава — 40-ы вынік (1 промах), Рустама Валіуліна — 43-і (2), Яўгена Абраменкі — 49-ы (0). Можна смела сцвярджаць, што калі б Абраменка выступаў сярод першай паловы, то яго пазіцыя была б куды вышэйшай. Усяго ж стартавала 88 удзельнікаў, 60 лепшых з іх возьмуць удзел у пасьюце.

У канькабежцаў дыстанцыю 5000 метраў выйграў тытулаваны прадстаўнік Нідэрландаў Свэн Крамэр. У скачках з трампліна лідар агульнага заліку Кубка свету швейцарац Сімон Аман даказаў сваю сілу і другі раз (першы ў 2002 годзе) стаў алімпійскім чэмпіёнам. Другім тут стаў паляк Адам Малыш, які доўга трымаўся ў цяні, але „выстраліў" у патрэбны момант. А ў лідары агульнага заліку выйшлі амерыканцы — у мужчынскім шорт-трэку і жаночым могуле (дысцыпліна фрыстайла) яны заваявалі адзін залаты, адзін сярэбраны і два бронзавыя медалі.

Такія асноўныя вынікі першых двух дзён белай алімпіяды. Будзем сачыць за ёй далей.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Расце круг чытачоў „Нівы”

Адным з пастаянных чытачоў „Нівы” з’яўляецца Віктар Кабац, мастак з Гайнаўкі. Ён зрабіў падпіску на беларускі штотыднёвік на ўвесь 2010 год. Калі ўжо прачытае чарговы нумар роднага тыднёвіка, тады нясе яго ў Гарадскую публічную бібліятэку ў Гайнаўцы. У чытальні ГПБ яна ляжыць на бібліятэчнай паліцы і ўсе ахвотна бяруць яе чытаць.

— Я „Ніву” чытаю дакладна, сачу за кожным яе нумарам. Мяне цікавяць і артыкулы журналістаў, але не мінаю і допісаў карэспандэнтаў з вёсак. Калісьці „Ніву” чытаў мой бацька. Я яго пераймальнік, — кажа В. Кабац.

Круг чытачоў роднага часопіса пашыраецца з кожным тыднем. Зараз „Ніву” чытаюць Люба Трусевіч, харыстка калектыву „Нараўчанкі” з Нараўкі, Мікалай Ігнацюк, Міраслаў Смольскі, Лідзія Грыгарук, Нэля Харкевіч, Зіна Сахарчук і Вольга Максімюк з Новага Ляўкова, Мікалай Сухадола з Падляўкова і Ніна Матысюк са Старога Ляўкова.

Да суботы, 6 лютага г.г., чытачы выкупілі ўсе шэсць экземпляраў „Нівы” № 6 у крамах ГСу ў Плянце і ў Старым Ляўкове. Член калектыву „Цаглінкі” са Старога Ляўкова купіў „Ніву”, бо ў шостым нумары быў фотарэпартаж „Семнаццаты фестываль” Міры Лукшы. Чакаў ён допісаў мясцовага карэспандэнта. Чытачы шукаюць у „Ніве” інфармацыі перш-наперш з Гайнаўшчыны, Бельшчыны ды з Беластоцкага павета.

9 лютага г.г. прадаўшчыца ў кіёску на пошце ў Гайнаўцы паінфармавала, што мае яшчэ 100 экземпляраў „Нівы” з беларускім календаром. Але ёсць на яе пакупнікі.

НАШЫ карэспандэнты

Фота Міры ЛУКШЫ

Акно ў свет

Зіма не адпускае. Дарогі снегам занясло, нельга варухнуцца з хаты. Сядаю затым за пісьмовы стол, да камп’ютэра, пакарыстацца дабрадзейнасцю тэхнікі. Інтэрнэт — гэта сапраўднае акно ў свет. Што хочаш тут знойдзеш. З прэсавымі навінкамі пазнаёмішся, праграму тэлебачання ды расклады язды публічнага транспарту пад рукой маеш. Нават пры дапамозе інтэрнэту закупку можна зрабіць не выходзячы з хаты і рахункі заплаціць. Мне, як карэспандэнту, асабліва спатрэбілася электронная пошта.

Даўней пісаныя ўручную тэксты пасылаў я па традыцыйнай пошце, пасля карыстаўся факсам, дзякуючы дабрадзейнасці гмінных чыноўнікаў. Нерваваўся прытым, бо з гэтым неаднойчы былі праблемы. Як не сюрпрызы натуры (снегапад, галалёдзіца або лівень), дык капрызы чыноўнікаў перашкаджалі. Рашыў затым купіць лічбавы фотаапарат ды кам’пютар. Праўда, граша шмат прыйшлося выкінуць, але і карысць па сённяшні дзень засталася. Тэксты на хаду ў рэдакцыю пасылаю і не ўручную пісаныя, а кірыліцай, на беларускай мове. І каляровыя здымкі не патрабуюць зараз лабараторнай апрацоўкі. Вось, што значыць тэхнічны прагрэс!

Мне, даўнейшаму вясковаму пастушку, у думцы не мільганула, што, будучы калісьці пенсіянерам, пакарыстаюся камп’ютарнай тэхнікай. А ўсё гэта здабыў дзякуючы сябрам з „Нівы”. Ад іх атрымаў штуршок для падтрымвання супрацоўніцтва з рэдакцыяй. Яны дапамаглі абяспечыцца кірылічнай эдытарскай праграмай і навейшым польска-беларускім слоўнікам. А пры нагодзе хачу „пахваліцца” яшчэ адным падарункам, які атрымаў ад ніўскіх сяброў з нагоды 70-гадовага юбілею — вэб-камеру з мікрафонам для скайпа, якая дазваляе бачыць свайго суразмоўцу ў час інтэрнэт-размовы. Варта адзначыць, што пры такой тэхніцы можна бясплатна размаўляць з суразмоўцамі з усяго свету, абы толькі яны такой жа карысталіся тэхнікай.

Канчаючы свой допіс, ад шчырага сэрца яшчэ раз дзякую сябрам па пяру за ўсё, што мне зрабілі, ды заахвочваю калег карэспандэнтаў да выдатнейшага супрацоўніцтва з рэдакцыяй. Карысць будзе ўзаемная. Таго вам жадае

Уладзімір СІДАРУК

Нараўка

Патрэбная прыбіральня для пасажыраў

У Нараўцы збягаюцца дарогі з розных бакоў і тут спыняюцца аўтобусы ПКС ды прыватныя ля ўсяго адной пачакальні пад дашком. Тут рухлівы вузлавы, так бы мовіць, аўтапрыпынак, а прыбіральні для пасажыраў няма. Найгорш цяпер, зімой: ні ў кусты, ні пад мост на рацэ Нараўцы... Зараз усюды снегу намяло пад пахі.

Ехаў я з Гайнаўкі, а ў Нараўцы сеў у аўтобус Валодзя Гайдук, паэт з Тарнопаля. Ён папрасіў мяне, як раднага і карэспандэнта „Нівы”, заняцца гэтай справай. Гэта не дробязная праблема: што рабіць, куды дзецца, калі моцна прыпіліць?..

Мне вядома, што аднойчы радныя з Нараўчанскай гміны гаварылі з войтам падчас сесіі Гміннай рады, што ў Нараўцы на аўтобусным прыпынку патрэбны пераносны туалет. Бадай што сам камендант мясцовай паліцыі выступіў з такой прапановай. Але так і на гэтым закончылася. А то прыбіраць трэба, а на гэта грошы з гміннай касы трэба выдаць.

Мо мой допіс у „Ніве” зварушыць з месца справу неабходнай для пасажыраў прыбіральні?

Міхалоўская гміна

Разам ісці праз жыццё

Нядаўна ў ЗАГСе ў Міхалове (Беластоцкі павет) 25 пар святкавала 50-годдзе свайго шлюбнага сужыцця. Прыехалі яны з усіх бакоў гэтай вялікай гміны. Ізноў — так, як паўвеку таму — прагучаў для іх марш Мендэльсона. Гэтае магічнае святкаванне не кожнаму дадзенае. Пяцьдзесят супольна пражытых гадоў гэта сімвал любові, веры, пашаны, сапраўднай прыязні. Гэта ўзор для маладога пакалення, якое цяпер бярэ шлюб.

Юбіляры атрымалі дыпломы і медалі „За шматгадовае шлюбнае жыццё”. Уручыў іх бурмістр Міхалова Марк Назарка. Медалі атрымалі м.інш. Фёдар і Яўгенія Баршчэўскія, Яўген і Ніна Ціванюкі, Юзаф і Галена Хмялеўскія, Уладзіслаў і Раіса Давідовічы, Сцяпан і Яўгенія Дудкі, Яўген і Валянціна Грыцы, Сцяпан і Ірэна Гайдукі, Анатоль і Таццяна Кананчукі, Анатоль і Ніна Кулешы, Аляксей і Сафія Лешчукі, Яўген і Зіна Матвейчукі, Аляксандр і Яўгенія Міруці, Мікалай і Леаніла Монахі, Ян і Сафія Носы, Ян і Лідзія Ахрымюкі, Пётр і Лідзія Панько, Аляксандр і Кацярына Павільчы, Ян і Марыя Самойлікі, Яўген і Людміла Трусевічы ды Уладзімір і Вера Урбановічы.

На заканчэнне ўрачыстасці юбіляры выпілі традыцыйны келіх шампанскага. Атрымалі яны букеты кветак ад прадстаўнікоў гмінных улад ды ад сваіх пляменнікаў. Усе зычылі ім далейшых шматлікіх гадоў жыцця ў здароўі і шчасці.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Адгаданка

1. чырвоная вадкасць у арганізме, якая і ледзянее, і кіпіць, 2. горад на Нёмане з касцёламі і кляштарамі бернардзінцаў, брыгітак, езуітаў і францысканцаў, 3. прысуд, 4. да карэты не пасуе, 5. тытул Рагвалода, Усяслава, Вітаўта, 6. расце доўга, гарыць хутка, 7. горад на Прыпяці з касцёламі бернардзінцаў, францысканцаў і Карла Барамея, 8. скуралуп, які таксама лавіў бездаглядных сабак.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — партугальская пагаворка. **(ш)**

			1				2
3							
		4			5		
6			7				
				8			

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 3 н-ра

Экіпаж, яблык, Нява, салома, ля, ядро, драма, веласіпед, дуга, палын.

Рашэнне: **Бядняк і пасля яды галодны.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

У заснежаным ГРОДНЕ

У заснежаны вечар, у пятніцу, разам з Мірай Лукшай мы злёталі ў Гродна. Нам мусова было паглядзець карціны Алеся Квяткоўскага. Выстаўка поўнасцю прысвячалася творчасці Анатоля Сыса. Паколькі яе закрывалі ў панядзелак, каб паспець, мы дамовіліся з Марысяй Мацко, уласніцай галерэі „Крыга", на сустрэчу ў дзевяць вечара. Мы не прадбачылі, што гістарычныя падзеі нанясуць карэктуру ў нашы планы.

— Выглядае, што мы праціраем шлях з Беластока ў Беларусь! — пракаментавала Міра.

Ну, і праціраем яго сваім целам...

Праўда, пра гістарычную падзею мы згадалі толькі на мяжы ў Кузніцы-Беластоцкай, калі пабачылі чаргу „на дзесяць гадзін". Сёння, 12 лютага 2010 года, у Варшаве міністры Сяргей Мартынаў і Радаслаў Сікорскі падпісалі дамову аб малым памежным руху між Польшай і Беларуссю. Гэтага гістарычнага моманту мы чакалі гадамі. І калі хто раней пытаў навошта такі дагавор, мы звычайна гаварылі: *каб свабодна ездзіць у галерэю або гродзенскі тэатр!*

На месцы мы зразумелі, што ідэю свабоднага руху без дадатковых пагранпераходаў цяжка ўспрымаць як палёгку. Праўда, нас, як грамадзян Еўрасаюза, прапусцілі „без чаргі" і мы перасякалі мяжу толькі тры гадзіны. А гродзенцам, што таксама выправіліся ў галерэю „Тэска" ў Саколцы і зараз вярталіся дамоў, прыйшлося чакаць больш за дзесяць гадзін, аж да раніцы...

У нашым падарожжы быў яшчэ адзін смакавіты момант. Мы перасякалі мяжу разам з журналістамі з Гродна. У пэўны момант яны пачалі хвалявацца за нас:

— А што скажаце, калі спытаюць пра мэту вашай паездкі? — спытала нас заклапочаная Святлана. Калі яны ехалі ў Польшчу, палякі іх дэталёва распыталі куды ды навошта едуць, дзе і з кім будуць сустракацца... Мы доўга думалі які адказ можа задаволдіць беларускага памежніка. Сказаць, што едзем ноччу ў мастацкую галерэю — малаверагодна і дужа падазрона. З гэтай нагоды нас маглі б паклікаць на асабісты кантроль! Такім чынам мы зафундавалі б сабе дадатковыя гадзіны на мяжы. Аж прыдумалі: *Скажам, што едзем на Валянцінкі!*

* * *

Хаця набліжалася адзінаццаць вечара, Гродна пульсавала яшчэ жыццём. На сустрэчу ў галерэю „Крыга" мы з'явіліся дзве гадзіны пасля дамоўленага часу. Аднак у тым закалоце былі сакрэтны сэнс і метафізіка. Наш візіт, у ходзе якога мы ў асноўным успаміналі Анатоля Сыса, зацягнуўся да другой гадзіны ночы. Пасля спадарыня Марыся прапанавала нам прагулку па начным Гродне. З-за акна машыны заснежаны горад выглядаў як рамантычная карціна. Запамятаўся Нёман, які тонкай стужкай прабіваўся між заснежанымі і скаванымі лёдам берагамі і напамінаў нашу Нарву. Гродзенцы падказалі, што рака плыве толькі ў Гродне, па-за межамі горада яна скаваная лёдам, па якім можна ездзіць трактарам.

З галерэі мы завіталі на чыгуначны вакзал, самы жывы начны пункт горада. Тут як за дня перамяшчаліся пасажыры, міліцыя, падазроныя групы падлеткаў. На добрую справу маглі б мы вяртацца ў Беласток, а палове пятай адпраўляюць цягнік у Кузніцу. Але мы прыгадалі пра „Валянцінкі", „Масленіцу", „Запусты" і іншыя справы ды рашылі астацца ў горадзе над Нёманам. Вельмі ж хацелася прагуляцца па заснежанай вуліцы Ажэшкі, наведаць славуты кніжны магазін ды сустрэцца з сябрам-паэтам. Проста з вакзала мы пайшлі ў свой улюбёны гатэль (за два долары ад асобы). Там, у цяпле і чысціні, мы заснулі сном справядлівых заўсёднікаў галерэяў. Светла-гаючыя карціны Алеся Квяткоўскага вярнуліся ў сне, здавалася, што ўвесь горад пахне мёдам.

* * *

З раніцы да вечара вуліцы Гродна здаваліся надзвычай ажыўленымі. Самай гарачай кропкай у гэты масленічны дзень паказаўся нам завулак ля вуліцы Савецкай, дзе будынак ЗАГС-у. За час нашай гадзіннай тут пабыўкі мы сустрэлі каля дзесяці вяселляў. Маладыя, замест у царкву, пасля грамадзянскага шлюбу ішлі яшчэ ў Парк Жылібера сфатаграфавацца. Белыя сукенкі маладух аж зіхацелі на фоне заснежанага парку, ад іх пахла вясной і „Валянцінкамі". Мы паназіралі яшчэ за тыповымі прагулкамі гараджан. Самым папулярным месцам паказаўся нам Універмаг. На ўсіх трох паверхах пераліваліся туды-сюды натоўпы, часта без відавочнай справы, быццам для адпачынку або шпацыру. Таксама ў кавярнях не было свабодных месц, хоць нам пашанцавала прысесці ў бары „Карчма". Тут мы пасмакавалі беларускі жур, сырна-піўны суп, дранікі з грыбамі і смятанай, якую сервіруюць у глінянай, стылізаванай на старажытную, пасудзіне. Наш гродзенскі сябра-паэт, які правёў з намі цэлы дзень, успамінаў візіт Анатоля Сыса ў Гродна ў пачатку дзевяностых. Падзею доўга памяталі ва ўніверсітэце.

— А зараз нашы студэнты не ведаюць хто гэта Анатоль Сыс, — пачулі мы ў галерэі „Крыга". Магчыма з-за гэтай інфармацыі па сёння пераследуе мяне адзін вобраз. На двары ўніверсітэта аж кішэла ад міліцыі. Праўда, ахоўнікі парадку тут толькі прыбіралі, карацей, расчышчвалі двор ад снегу. Неяк недарэчна выглядалі студэнты, якія стаялі сабе на прыступках і смалілі папяросы. Фізічная блізкасць між міліцыяй і студэнтамі прамаўляла як метафара калабарацыі. Падвялі нас і „Валянцінкі", нідзе мы не маглі набыць карткі ці сэрцайка з беларускім надпісам.

У гандлёвай галерэі „Нёман"

Міліцыя чысціць універсітэт

У мастацкай галерэі „Крыга"

21.08 — 27.08

(22.03. — 20.04.) Настаўся на супрацоўніцтва, не сапернічанне. Не кіруйся першым імпульсам. 24-28.02. адчуеш адмоўны ўплыў зорак на твае адносіны з атачэннем. З-за няўмеласці дагаварыцца можаш страціць у фінансах. 28.02. можаш мець кепскі настрой ці пагоршыцца табе ў здароўі. Не бяры на сябе больш, чым падымеш.

(21.04. — 21.05.) Паявіцца шматабяцальнае знаёмства, паправяцца кампанейскія стасункі. Поспех дзякуючы таму, што моцна ступаеш па зямлі. У пары час змагання не з сабой, а за справу, якая вас супольна датычыць. Не рабі дарагіх пакупак і не фарсіруй здароўя (хоць яно ў цябе неблагое).

(22.05. — 22.06.) Будзеш лагодны як баранчык, поўны добрай волі. Кіруйся інтуіцыяй, нават калі розум падказвае іншае. Налягуць на цябе абавязкі. 22-26.02. хтосьці схоча абмежаваць тваю волю і свабоду.

(23.06. — 23.07.) Аптымістычнае стаўленне да жыцця давядзе да таго, што 24-28.02. прыцягнеш да сябе незвычайнае шчасце. Але зрабі тое, што маеш зрабіць, не ўваходзь у ніякія гульні. Для здароўя выкарыстай альтэрнатыўную медыцыну і найноўшыя дасягненні тэхнікі.

(24.07. — 23.08.) Да 25.02. можаш папхнуць уперад найважнейшыя справы. Інтуіцыя цябе не падвядзе, таму не рабі нічога супраць сабе. Здольнасць прадбачвання трэндаў. Твая фантазія і ўмеласці кінуць усіх перад табой на калені. У кухні прымяняй больш гародніны і траваў. Незалежна ад цяжкасцей, шмат дасягнеш.

(24.08. — 23.09.) Чакаюць цябе вялікія змены і неспадзяванкі. І не ўсе мілыя. Дзякуючы ім адкрыюцца табе вочы на справы, якіх ты дагэтуль не прыкмячаў. У апошнія дні лютага будзеш прымушаны зрабіць штосьці, на што зусім не будзеш мець ахвоты.

(24.09. — 23.10.) Службовыя абавязкі стануць для цябе чыстай прыемнасцю. Зможаш заспакоіць усе прыхамаці. У любоўных выбарах не камбінуй, проста кіруйся сэрцам. Твае амбіцыі адціснуцца на заробках, што будзе тым больш прыемнае, што і партнёр заробіць больш. Вагой не пераймайся, еж смачнае і карыснае.

(24.10. — 22.11.) 21-25.02. зачаруеш атачэнне так, што асоба, на якой табе найбольш залежыць, упадзе табе да ног! Многа адвагі для пераламання страху, які табе часта адбірае ахвоту да дзеяння. Пераканаеш усіх, што ты чалавек поспеху. Найлепш падзейнічае на цябе прысутнасць асобы, з якой падзелішся радасцю і тугой.

(23.11. — 22.12.) Зразумееш як прыемна даваць, не чакаючы нічога ўзамен. Дачакаешся грошай. З радасцю вернешся да пакінутага хобі. Не адмаўляйся ад дробных заняткаў і кантактаў з людзьмі, з якімі мала супрацоўнічаеш — яны прыдадуцца табе пазней.

(23.12. — 20.01.) На працы, калі будзеш папракаць іншых у памылках, любіць за гэта цябе не будуць. Калі шукаеш кагосьці на ўсё жыццё, можаш сустрэць копію свайго першага кахання. З кімсьці, хто цябе абгаварыў, папсуюцца адносіны. Схочацца парваць таксама са справамі, якія сталі для цябе цяжарам.

(21.01. — 19.02.) Дай сабе час для таго, каб некалькі разоў перадумаць адносіны з партнёрам. З-за яго хцівасці можаш нарабіць памылак. Калі ты будзеш віноўным у памылцы, лепш прызнайся адразу, без скандалу. З прыемнасцю пабачышся з асобамі са знакаў Быка і Рака.

(20.02. — 21.03.) Цяпер усе прыкмецяць цябе і твае дзеянні. Дбай таксама аб сваю красу і здароўе. Пільнуйся: з-за апасак, якія ахопяць цябе ў апошнія дні лютага, можаш страціць цікавую прапанову працы. Поўня Месяца (28.02.) выявіць тваіх ворагаў; не пакажы па сабе, што іх баішся!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960